Тыднёвік Магілёўскі



№ 5 (46) 4 лютага 1999 г. Кошт свабодны

✓ ТЭМА НУМАРУ

Палітычныя, арганізацыйныя і маральныя вынікі Кангрэса дэмакратычных сілаў Беларусі, *якія адбыліся ў Менску 29–30 студзеня 1999 году*



• *Менск. 30 студзеня 1999 году. Кангрэс працягваўся на вуліцах.*
(Фота IREX/ProMedia)

На шляху Кангрэса дэмакратычных сілаў было нямала перашкодаў. Як заўсёды, на гэтым напрамку бессаромна шчыравала ўлада. Аднак значна больш цяжкасьцяў давялося пераадолець арганізатарам форуму ў сваім-жа, апазыцыйным асяродзьдзі.

Для дэмакратаў сталася агульным месцам іхнае няўменьне дамаўляцца паміж сабой. Аднак рэальная пагроза страты краінай незалежнасьці ў выніку апошніх лукашэнкаўска-ельцынскіх пагадненьняў прымусіла дэмакратаў паскорыць працэс дамаўленьня, кансалідацыі й разумных кампрамісаў. Таму кожны, каму давялося ў гэтыя два дні быць у залі Кангрэсу, амаль фізічна адчуваў пачатак новага этапа ў дэмакратычным нацыянальным руху. Пры гэтым ніводная партыя не адмовілася, зразумела, ад сваіх мэтаў і свайго стратэгіі. Ніводзін грамадзкі рух ня стаўся закладнікам палітычных сымпатыяў. Ніводзін прэтэндэнт на беларускае лідэрства не выказаў намеру саступіць месца іншаму...

Гэтага ніхто ні ад каго не патрабаваў. Гэтым не спэкулявалі, гэтым не гандлявалі. Гэта, па агульнай паляраднай дамове прадстаўнікоў партыяў і рухаў, адкладзена на час, які прыйдзе пасьля перамогі. Зараз галоўнае – яна, перамога. Над пануючай дыктатурай, над анэксіяй, якая плянуецца збанкрутаванай уладай, над існуючым народным жабрацтвам, над хамскім разбурэньнем маралі і культуры.

Гэтыя мэты дэмакратычных сілаў былі заяўленыя перад больш чым 700 дэпутатамі ў дакладах, выступах, вітальных зваротах. Яны знайшлі сваё абгрунтаваньне адлюстраваньне ў рэзалюцыях і ўхвалах (*некаторыя мы падаем у скароце на іншых старонках газэты*). На пасьляканграсавым мітынгу да іх далучылася як меней 5 тысячаў мінчукоў.

На Кангрэсе прысутнічалі, што сталася з іх боку выразным жэстам падтрымкі, прадстаўнікі вядучых дэмакратычных арганізацыяў, заканадаўчых сходаў сваіх краінаў, дыпляматычнага корпусу з Польшчы, Украіны, Літвы, Латвіі, Чэхіі, Нямеччыны, Італіі, ЗША. Найбольш сьціплым было расейскае прадстаўніцтва. З Масквы на форум прыехаў толькі лідэр Партыі эканамічнай свабоды дэпутат Дзярждумы К.Баравой.

Кангрэс віталі міжнародныя арганізацыі, прадстаўніцтвы й місіі. Ягоную работу асьвятлялі журналісты з больш чым 80 беларускіх і замежных выданьняў і тэлекампаніяў (сярод якіх, праўда, не былі заўважаны прадстаўнікі нашых дзяржаўных СМІ, а расейскія, праўдападобна, пасьля першага дня работы дэмакратычнага сходу атрымалі распараджэньне больш не падаваць пра яго інфармацыю).

Многае на Кангрэсе йшло і адбывалася так, як было вызначана ў выніку, як ужо адзначалася, складанай і няпростай падрыхтоўчай працы Аргкамітэту. Між тым не абышлося без добрых сэнсацыяў, без незапланаваных, а таму асабліва шчырых ініцыятываў (як і без спробаў ім перашкодзіць).

Па прапанове дэлегатаў з вобласьцяў былі сфармуляваныя і аднагалосна прынятыя Кангрэсам дзьве Заявы, якія ня толькі робяць гонар дэлегатам, але і сьведчаць аб працэсе рэальнай кансалідацыі ўсіх сумленных і сьвядомых грамадзкіх сілаў Беларусі.

Кангрэс патрабаваў ад цяперашняга ўрада краіны гарантыяў адмовы ад перасьледу Зянона Пазьняка, пры ўмове ягонага вяртаньня на Бацькаўшчыну. З просьбай выступіць пасярэднікамі ў дасягненьні такіх гарантыяў Кангрэс зьвярнуўся да ўрадаў краін Эўрапейскага Зьвязу і ЗША. Другі дакумэнт прагучаў у абарону Васіля Старавойтава.

Абедзьве ўхвалы дэлегаты віталі стоячы. Абедзьве яны будуць раслаўсюджаныя ў замежжы дзеля інфармаваньня міжнароднай супольнасьці.

Цяжкі шлях яднаньня й кансалідацыі ўсіх дэмакратычных сілаў пачаўся. Ён варты руплівасьці і шчырых намаганьняў. Бо мэта ў яго такая-ж высокая, як і цана перамогі альбо паразы – Беларусь.

Генадзь СУДНІК,
дэлегат Кангрэсу

Інтэрвію па дарозе

*Група магілёўскіх дэлегатаў Кангрэса дэмакратычных сілаў ехала да Менску разам, адным аўтобусам. Апынуўшыся ў тым-жа салёне, карэспандэнт «ТМ» ня мог ня выкарыстаць такой магчымасьці. Дэлегатам было прапанавана адказаць на адно пытаньне: **На які вынік Кангрэсу Вы спадзяецеся?***

У некага з нашых чытачоў можа ўзьнікнуць сумнеў, а ці варта публікаваць адказы цяпер, пасьля таго як Кангрэс стаў фактам гісторыі, набыў міжнароднае гучаньне, ды проста – прайшоў пасьпяхова й плённа? Варта. Надта часта гэта не супадае: намеры і вынікі, мэты і сродкі, словы і справы. Беларуская апазыцыя, разагнаваная і падзеленая на свае структуры, ня больш тут выключэньнем. Таму гэтая заўсёды ня толькі цікава, але й карысна ведаць, – з якімі думкамі і з якім настроем бяруцца людзі за справу.

*Такім чынам, на пытаньне: **На які вынік Кангрэсу Вы спадзяецеся?** адказалі:*

• **Уладзімер АЛЕЙНІКАЎ**, прыватны гаспадар, сябра БНФ, г. Шклоў
– Спадзяюся, што падчас Кангрэсу асталяе дэмакратычныя сілы нарэшце зразумеюць неабходнасьць работы над падвышэньнем нацыянальных пачуцьцяў народа дзеля захаваньня нашай дзяржавы.

• **Віктар АБРАМОВІЧ**, прадпрымальнік, старшыня грамадзкага форуму «Чыстая плынь», г.Магілёў
– Кангрэс проста абавязаны ўмацаваць людзей, якія сталі на шлях аднаўленьня Беларусі.

• **Вячаслаў СВІЗУНОЎ**, старшыня гарадзкой арганізацыі БНФ, г.Бабруйск
– Кангрэс, спадзяюся, стане шырэйшай магчымасьцю кантактаў і сустрэч і, зразумела, стане крокам да ўсьведамленьня таго, што незалежнасьць – найвышэйшая каштоўнасьць. Дапаможа ўсім нам зразумець, што склаўшы свае высілкі і магутнасьці, мы зможам перамагчы дыктатуру.

• **Аляксей КОЛЧЫН**, інжынэр, сябра БНФ, г.Магілёў
– Ці можна чакаць ад Кангрэсу доўгашуканай кансалідацыі? На жаль, думаю, – не. Ці можна чакаць вырашэньня праблемаў – відаць, не. Прыняцьця важкіх рашэньняў – наўрацці. Значыць, чакаць можна толькі дэкларацыяў. Добра, каб была адна дэкларацыя, ясная і простая: аб пазыцыі і намерах.

• **Алесь СЕРДЗЮКОЎ**, журналіст, старшыня гарадзкой арганізацыі Беларускае сацыял-дэмакратычнае партыі «Народная Грамада», г.Магілёў
– Упэўнены, што Кангрэс стане сьведчаньнем моцы і адзінства дэмакратычных сілаў, пераканае многіх у тым, што зараз не да партыйнай дзялёжкі «скуры незабітага мядзьведзя». Спадзяюся, што дэмакратычныя сілы здолеюць выпрацаваць структуру каардынацыі намаганьняў усіх апазыцыйных колаў краіны і, магчыма, вызначацца па адзінай кандыдатуры на беларускіх прэзыдэнцкіх выбарах.

• **Анатоль ФЁДАРАЎ**, старшыня абласной і гарадзкой арганізацыяў БНФ, г.Магілёў
– Спадзяюся, што Кангрэс паставіць апошнюю кропку ў дыскусіі ў беларускім грамадзтве наконт магчымасьці ўдзелу дэмакратычных арганізацыяў у выбарах, якія наладжвае дыктатарскі рэжым, і падтрымае рашэньне Вярхоўнага Савета аб правядзеньні выбараў прэзыдэнта. Кангрэс, я перакананы, створыць дадатковыя чыньнікі для фармаваньня сапраўднай беларускай улады, з'яднае дэмакратычныя сілы, каб не дапусьціць ліквідацыі нашай дзяржавы.

• **Міхась БУЛАВАЦКІ**, выкладчык (часова беспрацоўны), старшыня гарадзкой арганізацыі Беларускае сацыял-дэмакратычнае Грамады, г.Магілёў
– Спадзяюся, што Кангрэс стане чарговым і важкім крокам у пошуках згоды паміж апазыцыйнымі партыямі, арганізацыямі, і дапаможа ўсім усьвядоміць меру сваіх супольных магчымасьцяў у барацьбе з дыктатурай.

• **Віталь МАКАРАНКА**, студэнт (на акадэмічнай вакацыі), сябра БНФ, г.Магілёў
– Кангрэс прадэманструе наяўнасьць апазыцыі ў краіне і грамадзтве. На нейкія больш важкія вынікі не разьлічваю, бо ня могуць аб'яднацца тыя, хто «уступіў» у апазыцыю толькі таму, што быў пакрыўджаны Лукашэнкам, і тыя, хто адпачатку не прыняў гэты рэжым як працяг камунізму.

• **Алесь АСІПЦОЎ**, рабочы, старшыня згуртаваньня моладзі «Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу», г.Магілёў
– Казаць, што я ўскладаю на Кангрэс вялікія спадзевы – гэта занадта. Існуе надзея, што людзі, якія будуць браць удзел у працы Кангрэса, прыйшлі ўрэшце да разуменьня таго, што далей бездань, пераскочыць якую паасобку не стае моцы. І, апынуўшыся ў гэтае бездані, мы рызыкуем у ёй і застацца назаўсёды. Жадаю нам усім посьпехаў і плённае працы.

✓ ТЭМА НУМАРУ

Супольная Плятформа дэмакратычных сілаў Беларусі

Мы, удзельнікі Кангрэсу, прадстаўляючы грамадзянскую супольнасьць усіх рэгіёнаў краіны, шматлікія палітычныя, грамадзкія і прафсаюзныя арганізацыі, Вярхоўны Савет Беларусі, навуку і культуру, незалежныя СМІ... прымаем наступную Плятформу ўзгодненых дзеяньняў дэмсілаў Беларусі:

1. Салідарна выступаем у абарону незалежнасьці краіны, у абарону нашай культуры і мовы, супраць далучэньня Беларусі да Расеі.

2. Падтрымліваем рашэньне Вярхоўнага Савета аб правядзеньні прэзыдэнцкіх выбараў у вызначаны Канстытуцыяй (1994г.) тэрмін і абавязваемся аказваць у гэтым садзеяньне.

3. Падтрымліваем патрабаваньні недзяржаўных прафсаюзаў, таксама як і афіцыйных, аб падвышэньні заробкаў і пэнсіяў, салідарныя з акцыямі пратэсту супраць зьбядненьня народу. Выказваем падтрымку маючым адбыцца ўвесну страйкам і іншым акцыям рабочага руху, накіраваным на дасягненьне адстаўкі прэзыдэнта.

4. Патрабуем вызваленьня палітычных вязьняў, публічнага і аб'ектыўнага разгляду ўсіх палітычна матываваных судовых справаў.

5. Лічым неабходным шырока інфармаваць людзей пра становішча ў краіне, вынікі антынароднай палітыкі ўладаў.

6. Прымаем дамову аб узгадненьні стаўленьня дэмакратычных партыяў да любых выбарчых ініцыятываў і аб каардынацыі сваіх дзеяньняў.

7. Падтрымліваем незалежную прэсу, бярэм на сябе задачу яе абароны ад рэпрэсіяў.

8. Патрабуем ад уладаў прадастаўленьня апазыцыі рэгулярнага эфіру на радыё й тэлебачаньні і абавязваемся гэтага дамагацца супольнымі дзеяньнямі.

9. Даручаем Каардынацыйна-кансультатыўнай Радзе распрацаваць меры па прызнаньні нелегітымнасьці лукашэнкаўскага рэжыму для краіны і па-за яе межамі, калі канстытуцыйная законнасьць у Беларусі ня будзе адноўленая да тэрміну сканчэньня паўнамоцтваў прэзыдэнта – 20 ліпеня 1999 г.

Уладзе зручна, калі ўсе «пад каллаком»

Амаль 2.000 разоў наведвалі ў мінулым годзе супрацоўнікі абласнога ўпраўленьня дзяржкантролю розныя мясцовыя ўстановы.

Наклалі штрафаў на іх аж у 543 мільярды рублёў. Амаль 100 чалавек сышлі з працы ў выніку гэтых праверак, а каля 1.300 чалавек былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасьці, і таксама заплацілі 1,7 штрафных мільярда. Лічбы ўражваюць.

Канешне, сярод пакараных нямала можна знайсьці вартых гэтага. Можна не сумнявацца, што і сёлета будзе ня менш вінаватых. Служба кантролю спэцыяльна створаная для гэтага. Іншая справа, што недасканалыя законы, процілеглыя дэкрэты, дылетанцкія ўказаньні зьверху нярэдка правакуюць парушэньні. Практычна кожны, хто займаецца справай, ужо ёсьць патэнцыйным парушальнікам. Для грамадзтва гэта небясьпечна. Затое для ўлады – зручна.

Зімой маразоў не чакалі

Як заўжды, прыродныя зьявы для нас зьяўляюцца нечаканасьцю. У восень ня ведаем, што будуць дажджы, а ўзімку маразы не чакаем.

Нізкія тэмпэратуры апошніх дзён прывялі да шматлікіх аварыяў. У Шклоўскім, Горацкім і Кіраўскім раёнах пацярпелі 265 населеных пунктаў. З-за нечаканых маразоў парвался дрот і парушыліся слупы на 80 электрычных лініях. Значныя перапынкі ў рабоце былі на 547 трансфарматарных падстанцыях. Практычна не давалі прадукцыі 90 жывёлагадоўчых фэрмаў. Трое сутак спэцыяльныя службы выпраўлялі зімовыя наступствы.

На думку спэцыялістаў з абласнога штабу грамадзянскай абароны, папярэднія страты ад маразоў і традыцыйнай неахайнасьці ўжо складаюць некалькі мільярдаў рублёў.

Куды штурхаюць камэрсантаў

Нашае жыцьцё падкідвае адзін за другім падарункі, пра якія ў нармальнай краіне кажуць: гэта маразм. Чытач ведае пра адзін з такіх «маразмаў па-беларуску», які зьвязаны з валютнай палітыкай дзяржавы.



Дзякуючы Нацыянальнаму банку, у нас зараз, па розных меркаваньнях, ад 7 да 16 валютных курсаў. Нядаўна зьявіўся самы новы. Ён самы высокі, складае 220 тыс. руб за 1$ і быў уведзены з цьмянай фармулёўкай: «для адлюстраваньня ў бугалтарскім уліку апэрацыяў з замежнай валютай». Што гэта такое – ніхто, канешне, не патлумачыў. А вось дзяржава ў асобе Івана Іванавіча, знакамітага паплечніка прэзыдэнта, ведае. Адразу-ж усе плацяжы за арэнду памяшканьняў, большыня якіх належыць Гаспадарчаму ўпраўленьню прэзыдэнта, прывязалі да гэтага новага курсу. Раней арыентаваліся на афіцыйны нацбанкаўскі курс, а ён у 2 разы ніжэйшы. Цяпер, натуральна, удвая ўзьляцелі і памеры плацяжоў.

Гэта асабліва адбілася на бізнэсоўцах. У многіх і няма такіх сродкаў. Як лічыць старшыня Магілёўскай асацыяцыі прадпрымальнікаў Валеры Ванькові́ч, наступствам сёньняшняй сытуацыі можа быць толькі адно – не надта багатым камэрсантам прыйдзецца сыходзіць са сваіх памяшканьняў. Відавочна таксама, што прыватны бізнэс яшчэ больш сыйдзе ў цень.

Кроніка
Сымона ГЛАЗШТЭЙНА



• Менск. 30 студзеня 1999 году. Кангрэс працягваўся на вуліцах. (Фота IREX/ProMedia)

✓ ТЭМА НУМАРУ

Пра адносіны да выбараў (з Рэзалюцыі Кангрэсу)

Кангрэс канстатуе, што ў краіне адсутнічаюць умовы для правядзеньня дэмакратычных выбараў, працягваюцца палітычныя рэпрэсіі, адсутнічае магчымасьць для апазыцыі карыстацца дзяржаўнымі СМІ, масава парушаюцца правы чалавека, заканадаўча абмяжоўваецца ўдзел у выбарах, ствараюцца ўмовы для непакаранай фальсыфікацыі вынікаў выбараў...

Удзел дэмакратычных сілаў у мясцовых выбарах у гэткіх варунках зьяўляецца абсалютна немагчымым. Гэтае рашэньне можа быць адмененае намі толькі пры выкананьні наступных умоваў:

– прыняцьця за аснову выбарчага закону, легітымнасьць якога не выклікае ўнутрыдзяржаўнага і міжнароднага сумневу

– неспалучэньня выбараў з рэфэрэндумамі

– спыненьня перасьледу грамадзянаў па палітычных матывах і вызваленьня ўсіх палітычных вязьняў

– забесьпячэньня прадстаўнікам усіх рухаў, палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў свабоднага доступу да дзяржаўных СМІ, у першую чаргу – да электронных

– фармiраваньня ўсіх камісіяў па выбарах дэмакратычным шляхам

– скасаваньня неабгрунтаваных абмежаваньняў на вылучэньне і рэгістрацыю кандыдатаў і на правядзеньне перадвыбарчай агітацыйнай кампаніі

– стварэньня ўмоваў грамадзкага даверу да вынікаў галасаваньня і грамадзкага кантролю за іх арганізацыяй і правядзеньнем.

Пра пагрозу дзяржаўнасьці і сувэрэнітэту Рэспублікі Беларусь (з Рэзалюцыі Кангрэсу)

25 сьнежня 1998 г. прэзыдэнт Расейскае Фэдэрацыі Б.Ельцын і прэзыдэнт Беларусі А.Лукашэнка заключылі антыканстытуцыйны пакт, які пагражае незалежнасьці Беларускае дзяржавы і фактычна вядзе да анэксіі нашай краіны Расеяй. Гэты пакт ёсьць пагрозай існаваньню беларускай нацыі.

Кангрэс дэмакратычных сілаў,

дэклярую́чы сваю прыхільнасьць да старадаўніх традыцый беларускае дзяржаўнасьці, палажэньняў, замацаваных у Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Рэспублікі Беларусь ад 27 ліпеня 1990 г. і Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г.,

пацьвярджаючы нязьменнасьць прынцыпаў дэмакратычнай, праўнай, сацыяльнай дзяржаўнасьці і сувэрэнітэту Рэспублікі Беларусь,

грунтуючыся на міжнародных абавязацельствах краіны і ўсьведамляючы сваю адказнасьць перад нашчадкамі за захаваньне нацыянальнай дзяржаўнасьці і культурнай спадчыны,

ЗАЯЎЛЯЕ:

1. Пра сталую каштоўнасьць дзяржаўнасьці і незалежнасьці Рэспублікі Беларусь як неабходнай умовы разьвіцьця дзяржавы і беларускай нацыі;

2. Пра неабходнасьць найхутчэйшай адстаўкі прэзыдэнта як палітыка, які паставіў сувэрэнную дзяржаўнасьць краіны на мяжу зьнішчэньня, давёў краіну да сацыяльнай варожасьці, жабрацтва і міжнароднай ізаляцыі;

3. Пра неабходнасьць поўнага аднаўленьня легітымных органаў дзяржаўнай улады праз правядзеньне свабодных дэмакратычных выбараў у вызначаныя Канстытуцыяй тэрміны;

4. Пра сваю рашучасьць бараніць незалежнасьць, дзяржаўнасьць і сувэрэнітэт краіны, процістаяць анэксіі Беларусі ўсімі даступнымі сродкамі.

Пра дыскрымінацыю беларускай мовы (з Рэзалюцыі Кангрэсу)

Удзельнікі Кангрэсу з надзвычайнай трывогай і болем зьвяртаюць увагу сусьветнай грамадзянскай і міжнароднай супольнасьці на тую мэтанакіраваную палітыку цяперашняй дзяржаўнай улады па ўціску роднай мовы карэннага насельніцтва, што ўтварае рэальную небясьпеку вынішчэньня адной з самых старажытных і багатых славянскіх моваў...

У выніку афіцыйнай палітыкі прэзыдэнта за апошнія чатыры гады практычна зьнішчана беларускамоўнае школьніцтва (сёлета ў сталіцы з насельніцтвам 2 млн. на роднай мове навучаецца 108 вучняў), няма ніводнай вышэйшай навучальнай установы з вывучэньнем усіх прадметаў на роднай мове, з навучальных праграмаў выключаныя біяграфіі і творы майстроў нацыянальнай літаратуры і культуры, гістарычных дзеячоў, катастрафічна згортваецца нацыянальнае кнігавыданьне (у 1997 г. з 5.331 кнігі па-беларуску выдадзена 862), звужаецца ўжываньне мовы ў СМІ, мовай не карыстаецца дзяржаўнае чынавенства, яе пазьбягаюць праваахоўныя, судовыя й іншыя дзяржаўныя органы і прадстаўніцтвы.

Кангрэс дэмсілаў заклікае сумленных грамадзянаў краіны зрабіць неадкладнай задачай, поруч са змаганьнем за свае палітычныя і сацыяльныя правы, барацьбу за нацыянальнае адраджэньне, у якой мова павінна стаць першавартаснай каштоўнасьцю.

Кангрэс запатрабаваў ад прэзыдэнта і органаў улады неадкладнага спыненьня сваёй ганебнай палітыкі ў галіне культуры і мовы.

Зварот Кангрэса дэмакратычных сілаў да міжнароднай супольнасьці, урадаў і парлямэнтаў

Канстатуючы, што палітыка Лукашэнкі прывяла да жахлівага зьніжэньня міжнароднага аўтарытэту Беларусі, практычнага разарваньня адносінаў з цывілізаваным сьветам, ізаляцыі краіны на падставе ўсё больш агрэсіўных і непрадказальных праяўленьняў з боку беларускіх уладаў да цывілізаваных нормаў супольнага жыцьця, – Кангрэс:

– Заклікае парлямэнты, урады і грамадзкасьць сьвету падтрымаць незалежнасьць Беларусі.

– Заяўляе пра поўную юрыдычную негрунтовасьць любых міждзяржаўных пагадненьняў, якія пагражаюць незалежнасьці Беларусі.

– Ускладвае адказнасьць за крызысны стан адносінаў краіны з міжнароднай супольнасьцю, вынікам якіх сталася замарожваньне супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі, практычнае згортваньне эканамічных адносінаў з разьвітымі краінамі, на Лукашэнку і ягоны ўрад.

– Пацьвярджае прыхільнасьць дэмакратычных сілаў Беларусі дэмакратыі, правам чалавека, эканамічным рэформам, дзяржаўнаму нэўтралітэту, прызнаючы ўсё гэта адзіным грунтам для будаваньня адносінаў дзяржавы з цывілізаваным сьветам.

– Выказвае ўдзячнасьць міжнародным арганізацыям, парлямэнтам і ўрадам, грамадзкасьці за падтрымку дэмакратыі ў Беларусі, непрызнаньне дыктатарскіх тэндэнцыяў беларускага кіраўніцтва.

– Дэмакратычныя сілы Беларусі пацьвярджаюць сваю зацікаўленасьць і гатовасьць да нармалізацыі міждзяржаўных адносінаў з усімі краінамі на прынцыпах безумоўнай павагі да сувэрэнітэту, дабрасуседзтва і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Памяць: Імгненьні й Час

з фотаархіва © І А Р.



• Магілёў. 9 верасьня 1990 года. Тагачасны дом палітасьветы. Канфэрэнцыя гарадзкой арганізацыі БНФ «Адраджэньне».

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

Крычаўскія нашчадкі бульдазэрыстаў ад цэнзуры

Улада і мастак... Канфлікт паміж імі мае глыбокія гістарычныя і сацыяльныя карані. Ён, па сутнасьці, ня можа быць вырашаны. Мастак імкнецца заставацца сабой, улада – зрабіць яго сваёй прыладай. Нагадаем, што за савецкім часам канфлікт дайшоў да прымяненьня бульдозэраў супраць мастацкай выставы. Нашая ўлада ставіцца да гэтай праблемы таксама па-хамску.

Я хачу расплавесьці аб адным з такіх канфліктаў, які адбыўся ў Крычаве мінулай восеньню.

А самая гісторыя пачалася летам. Беспрацоўны фотамастак Уладзімер Марачкоўскі зьвярнуўся ў наш гарадзкі Клюб недзяржаўных арганізацыяў з прапановай зрабіць сваю фотавыставу. На гэту справу мы знайшлі сьціплыя грошы, і Уладзімер з захапленьнем узяўся за працу. Напрыканцы жніўня выстава была гатовая. Мы радаваліся, што жыхары нашага не збалаванага культурай горада атрымаюць магчымасьць ўбачыць фотатворы высокага мастацкага ўзроўню.

Дырэктар раённага Цэнтра культуры А.Вярэніч ахвотна згадзіўся разьмясьціць выставу ў сябе. Хутка ўсё было гатова. Мы запрасілі на адкрыцьцё імпрэзы прадстаўніка ўлады. Аднак намесьніца старшыні райвыканкаму З.Скачкова, якая раней была «ідэалягічным» сакратаром райкаму КПБ, завітала да нас раней. Яна ў прысутнасьці аўтара абыйшла выставу, уважліва разглядзела ўсе творы і, нічога не сказаўшы, зьехала.

Назаўтра раніцай, за дзень да прызначанага адкрыцьця, ў Цэнтар культуры ледзь ня бегам прымчаўся загадчык аддзела культуры райвыканкама Генадзь Міхееў. Агледзеўшы выставу, ён распарадзіўся зьняць з экспазыцыі творы «Акт», «Супрацьстаяньне» і «Чырвоныя трохкутнікі». Тлумачэньне было простым і ніякага дачыненьня да мастацкіх якасьцяў твораў ня мела. На думку чыноўніка ад культуры (ці ад новай «ідэалёгіі»?), фотаздымак з выявай жаночай грудзі (здымак «Акт») – парнаграфія; фатаграфія царквы, насупраць якой стаіць помнік Леніну (так і ёсьць у горадзе, здымак «Процістаяньне») – распальваньне ў грамадзтве варожасьці; а фота «Чырвоныя трохкутнікі» наогул зьяўляецца паклёпам на савецкі лад. Вэтэраны з Расеі, Украіны ды Малдовы, якія тым часам былі запрошаныя на гарадзкое сьвята й маглі наведаць выставу, па словах Міхеева, маглі не зразумець сэнс гэтых фотаработ і нават пакрыўдзіцца. Уладзімер Марачкоўскі адмовіўся псаваць сваю выставу. Здымкі зьнялі са сьценаў залі самі «культурныя» чыноўнікі. Расхваляваны, пакрыўджаны мастак пасьля зьняў астатнія фотатворы – выстава зачынілася, так і не адчыніўшыся.

Мы не маглі дараваць такога чынавенскага самаўпраўства, не маглі пакінуць мастака ў такім стане. Мяне накіравалі на ягоную абарону. Са сп. Міхеевым я размаўляў цэлую гадзіну, але-ж паразуменьня мы не знайшлі. Я пытаўся ў чыноўніка, чаму ён узяў на сябе асабіста вырашаць лёс фотаздымкі, а ня даў магчымасьці жыхарам горада зрабіць гэта самім. Я маю такое права, – такім быў адказ.

Не знайшоў я паразуменьня ў кабінэце намесьніцы старшыні райвыканкаму З.Скачковай. Яна казала, што не супраць выставы, але спачатку фотатворы павінны былі быць разгледжаныя экспэртнай камісіяй, якая нібыта існуе пры райвыканкаме. Дамагчыся пазнаёміцца са складам гэтай камісіі, рашэньнем аб яе стварэньні, парадкам яе работы, як чытач ужо здагадаўся, мне не ўдалося. Паводзіны свайго падначаленага Міхеева начальніца ацаніла станоўча, за выключэньнем, магчыма, залішняй экспрэсіі.

Давялося пайсьці па пракуратурах і судах. Нідзе падтрымкі права мастака на ягонае бачаньне жыцьця, і права людзей на сваё ўласнае стаўленьне да мастацкай творчасьці не знайшоў. Ні пракурор сп. Міхневіч, ні загадчыца юрыдычнага аддзела аблвыканкама сп-ня Багуслаўская не знайшлі нічога незаконнага ў дзеяньнях крычаўскіх чыноўнікаў. Не прынялі нашае скаргі ў судзе. Я намерваюся падаць яе ў вышэйшую інстанцыю...

Мастак Уладзімер Марачкоўскі раіць мне кінуць усё, як ёсьць: ці-ж ім што-небудзь давядзеш?

Л. СЬВЕЦІК,
праваабаронца

Пра кансалідацыю дэмакратычных сілаў Беларусі (з Рэзалюцыі Кангрэсу)

За час станаўленьня незалежнай Рэспублікі Беларусь дэмакратычныя сілы краіны адказна ўсьвядомілі неабходнасьць шчыльнага ўзаемадзеяньня і каардынацыі працы ў імя абароны сувэрэннай дзяржаўнасьці, вяртаньня нашай Бацькаўшчыны на дэмакратычны шлях разьвіцьця. Гэта патрабуе ажыцьцяўленьня адпаведных арганізацыйных захадаў.

Прызнаючы гэта, Кангрэс пастанаўляе:

1. Стварыць Каардынацыйна-кансультатыўную Раду дэмакратычных сілаў Беларусі.

2. Вызначыць яе галоўнай мэтай каардынацыю дзейнасьці палітычных партыяў і грамадзкіх рухаў у ажыцьцяўленьні задачаў, ухваленых Кангрэсам дэмакратычных сілаў.

✓ ТЭМА НУМАРУ



ПРА НАШАЕ ЖЫЦЬЦЁ ТОЛЬКІ Ў ВЕРШАХ І РАСПАВЯДАЦЬ

Не хварэйце, суграмадзяне !

Паехаў я на Украіну
у слынны горад Трускавец,
а мэту меў я там адзіну:
далей працуем, ці – канец...
Зрабіць я мушу невялікі
ад гэтай тэмы адыход
каб патлумачыць, што за ліха
цягнула мяне ў той паход.
У Цэнтры я, сябры, працую,
і там імкнемся мы рабіць
супольна справу, за якую,
бывае, могуць і пабіць.
Правы людзей ды іх свабоды,
што дэкляруе нам Закон,
баронім мы ад дзяржыморды,
але пакуль што – моцны ён.
Дык вось партнэраў добрай справы
на Украіне мы знайшлі,
праект супольны напісалі –
і справы нашыя пайшлі.
Мы моладзь правілам вучылі
каб абаронцамі правоў
хоць некаторыя зь іх былі
(шукаем сьмелых тых галоў).
Ну вось: праблему мы рашылі
і я за рэчы ды ў цягнік.
У Львове-ж мусіў мэдыцыну
[illegible]
Ты не чакаеш, а хвароба
прыйшла знянацку каб тваю [illegible]
парушыць планы: канец году
прынёс сюрпрызы мне свае.
Вярнуўся я у Магілёў,
ды кучар «хуткай дапамогі»
мусіў набіраць [illegible],
ды Пан ня даў [illegible] ногі.
Дзяжурны лекар там адразу
мне горла мусіў «разарваць»:
ён спалохаўся тым зараз
з крывёю зь цела выцягнуць.
Фурацыліну літраў дзесяць
я там на горла сапсаваў.
А колькі я пэніцыліну
праз месяц мяккае прыняў!
Мяне – на рэшата – скалолі,
а горла – шышка для іх рук:
рэзаць, быццам я які-сьці кролік
ці, бач, паддосьледны пацук.
Усе ў лякарні тыдзень толькі
з такім дыягназам ляжаць,
а я дык тры разы па столькі
бакі там мусіў націраць.
Ўжо Каталіцкія каляды
ў лякарні ў ложку я правёў,
Вось Новы год, а мне ўсё рады
няма ад нашых дахтароў.
А як лячыць, калі з тых лекаў
мы маем просты і адзін –
ён незаменны (я бязь зьдзеку) –
то добры наш пэніцылін?
Я колькі слоў пра харчаваньне,
мабыць, скажу, бо тут знайшоў
адказ на важкае пытаньне:
ўвесь дэфіцыт куды пайшоў.
Штодзённа вам тут яйкі, масла,
і сыр, і рыба, кілбаса,
і грэчка, рыс, і нават мяса –
вось карціна ці ня ўся.
Карацей, такая, братка,
думка мне прыйшла ў галоў:
у лякарні кормяць – надта,
а ці варта – гультаёў!?
Дзе-ж дабрабыт падняць дзяржавы,
калі мы будзем лайдакоў
лячыць, карміць? Такой «халявы»
пазбавіць трэба і Закон
прыняць. А ў тым законе
прызначыць плату для ўсіх тых,
хто ў лякарне доўга стогне,
хай плаціць з грошыкаў сваіх!
Тады дзяржаўны наш бюджэцік
адразу гэтак(!!!) узрасьце,
што, мабыць, зможам мы нарэшце
не плясьціся у хвасьце
краін на чорным кантынэнце,
і зробім доўгі мы скачок
й пакінем ззаду нават немцаў,
і зоймем... першы мы радок!
Што чыньнікам такой высновы?
Тры тыдні зьдзеку нада мной.
Зь лякарні выйшаў я здаровы...
Ці штосьці стала з галавой?!

Валадар ЦУРПАНАЎ

Праграма тэлебачаньня з 8 лютага па 14 лютага

•• Понедельник, 8 февраля ••

Праграму тэлеканалаў мы друкуем на замову чытачоў. Гаспадары праграмы падаюць нам яе на расейскай. Рэдакцыя фізычна (па часе) не пасьпявае яе перакласьці. Просім разглядаць гэтыя старонкі як тэхнічна-службовы матэрыял, які ня мае дачыненьня да зьместу й характару нашай газэты.

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.05 Новости.
8.15 Резонанс.
9.10 Потребительская корзина.
9.25 Телебарометр.
9.40 "Сегодня с вами..." Председатель Центрального правления Белорусского общества инвалидов по зрению Анатолий Нетылькин.
10.05 Здоровье.
10.30 Усадьба.
11.15 "Проклятый уютный дом".
12.05 Теленавигатор.
12.25 Музыкальный салон.
13.15 "Благородный разбойник Владимир Дубровский". Худ. фильм.
15.15 Сериал для детей. "Приключения Шерли Холмс" (Канада).
15.40 Видеокурс французского языка.
16.05 ТВ — школе.
16.25 Мультфильм.
16.35 Авто-парк.
16.45 Премьера песни.
17.10 "А музыка звучит..."
17.35 Док.фильм.
18.05 "Проклятый уютный дом".
19.15 Политические диалоги.
19.40 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 О.Янковский и И.Селезнева в худ.фильме "Крейцерова соната". 1-я серия.
23.23 Криминальная хроника.
23.30 Белорусский хит-парад.
23.35 Третий тайм.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Жестокий ангел".
9.15 "Здоровье".
9.45 Поле чудес.
10.40 Мультфильм.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 "Каспер, который живет под крышей".
14.35 Классная компания.
14.55 Звездный час.
15.35 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Жестокий ангел".
17.15 Эти забавные животные.
17.45 Здесь и сейчас.
18.05 Программа "Человек в маске".
18.45 Телесериал "Вечный зов".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.50 "Охотники за сновидениями". (Заключительная серия).
21.45 "Взгляд".
22.30 Новость дня.
22.45 Фильмы Н.Михалкова. "Спокойный день в конце войны". "Автостоп".

"РОССИЯ"

6.00, 8.30, 8.45 Доброе утро, Россия.
8.15 Дежурная часть.
8.35 Телеигра "Программа передач".
8.50 Товары — почтой.
9.00 "Санта-Барбара".
9.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 23.35 Вести.
15.15 Мультфильмы.
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 Автомотоспорт: зимнее кольцо.
17.25 "Чужая жена и муж под кроватью". Худ. фильм.
18.30 Двойной портрет.
19.40 Подробности.
19.50 Любовь с первого взгляда.
20.30 "Избранник". Фильм о жизни и творчестве А.И.Солженицына. 1-я и 2-я серии.
22.25 "Жара в Лос-Анджелесе".
23.20 Дежурная часть.

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.00, 19.30, 23.00 Новости культуры.
7.25 "Синяя птица". Мультфильм.
8.15 Памяти Ю.Левитанского.
8.45 Книжный кладезь.
9.00, 15.00, 17.00 Новости.
9.05 "Классика американского немого кино". "Прерванный роман Тилли".
10.20 "Петербургские портреты".
10.45 Театр Армена Джигарханяна.
10.50 "Царская ложа".
11.40 "Российский курьер".
12.20 "Телефон". Мультфильм.
12.30 "Рассказы старого сплетника". Передача 1-я.
12.55 Боярский двор.
13.29 Азбука.
13.45 Живое дерево ремесел.
13.50, 15.05 У.Шекспир. "Ромео и Джульетта". Телеспектакль.
16.30 Поет Елена Образцова.
16.40 "Лукоморье".
17.05 "2003".
17.10 "Шалом". Передача 1-я.
17.35 Вижу цель.
18.00 "100 лет в кинозале". Док. фильм.
19.10 Чудо-сказка.
19.29 Азбука.
19.50 К 125-летию со дня рождения В.Э.Мейерхольда.
20.30 Арии из оперы Н.А.Римского-Корсакова "Царская невеста".
20.45 После новостей...
21.05 "Прерванный роман Тилли". Худ. фильм.
22.20 "Молитва". Док. фильм.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Ее звали Никита".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Вчера в "Итогах".
10.15 Куклы.
10.30 Итоги. Ночной разговор.
11.30 "Открытая книга".
13.30 "Скорая помощь" (США).
14.20 "Сегодняшко". Красная стрела.
15.30 "Захватчики" (США).
16.30 Впрок.
16.55 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

12.25 Пунктир.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Большой кайф,или Приключения в Новом Орлеане".Телесериал.
18.15 "Олимпионики".Мультфильм.
18.40 Бобруйский вариант.
19.00 Тяжелый день.
19.30, 21.00 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.35 "Опасно для жизни".Комедия.
23.00 День области.
23.10 "Последняя татуировка". Детектив.

2 КАНАЛ

18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Муз. антракт.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Дерзкие и красивые".
19.25 "Клуб "Белый попугай".
19.50 "Поздравления".
20.30 Мультфильм.
20.43 "Акапулько".
21.30 Высокая мода.
21.40 Фантаст. комедия ужасов "Забавные приключения кровавой мамочки".
23.20 Спортивная программа.

•• Вторник, 9 февраля ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 23.50 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.30 "Сегодня с вами..." Заслуженная артистка Беларуси Нелли Богуславская.
9.55 Мультфильм.
10.05 Семейный канал "На волне взаимопонимания".
11.15 "Проклятый уютный дом".
12.10 Третий тайм.
12.40 "А музыка звучит..."
13.10 "Все под богом ходим". Док. фильм БТ.
14.05 Турообъектив.
14.25 Бездельник.
15.15 "Приключения Шерли Холмс".
15.40 Видеокурс английского языка.
16.05 ТВ — школе.
16.30 "Наперекор судьбе". Телеочерк.
17.10 Уроки Н.Новожиловой.
17.35 Гости в дом. Ко Дню Святого Валентина.
18.05 "Проклятый уютный дом".
19.15 "Алло, "Событие". Прямая линия.
19.55 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 "Крейцерова соната". Худ. фильм. 2-я серия.
23.10 Криминальная хроника.
23.15 Белорусский хит-парад.
23.20 Музыка без границ.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Жестокий ангел".
9.15 "Взгляд".
10.00 Смехопанорама.
10.30 Играй, гармонь любимая!
11.15 Программа "Вместе".
14.15 "Каспер, который живет под крышей".
14.50 Счастливый случай.
15.35 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Жестокий ангел".
17.15 Угадай мелодию.
17.45 Здесь и сейчас.
18.05 Тема.
18.45 Телесериал "Вечный зов".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.50 Т.Доронина в фильме "Старшая сестра".
22.40 "Жизнь замечательных людей".
23.10 Новость дня.

"РОССИЯ"

6.00, 8.30, 8.45 Доброе утро, Россия.
8.15 Дежурная часть.
8.35 Телеигра "Программа передач".
8.50 Товары — почтой.
9.00 "Санта-Барбара".
9.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 23.40 Вести.
15.15 Сказочный полдник.
15.30 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
16.55 Компьютер.
17.05 О.Басилашвили, И.Смоктуновский, М.Ульянов и Ю.Яковлев в телефильме "Дело".
18.30 Двойной портрет.
19.40 Подробности.
19.50 "Аншлаг" представляет.
20.25 Д.Траволта в детективе "Прокол".
22.20 "Избранник". 3-я серия.
23.25 Дежурная часть.

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.00, 19.30, 23.00 Новости культуры.
7.25 "100 лет в кинозале". Док. фильм.
8.35 Русская усадьба.
9.00, 15.00, 17.00 Новости.
9.05 "Потомок белого барса". Худ. фильм. 1-я серия.
10.10 Омоним.
10.35 Вижу цель.
11.05 Образ жизни.
11.40 "Без визы".
11.45 За околицей.
12.00 Биатлон. Чемпионат мира. Женщины. 15 км.
13.29 Азбука.
13.45 Биатлон. Чемпионат мира. Женщины. 15 км.
14.00 А.Платонов. "Скрипка".
14.45 Поклонникам Терпсихоры.
15.05 "Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок".
15.35 "Лукоморье".
15.55 "Пушкин и судьбы русской культуры". Передача 1-я.
16.35 "Открытие таланта".
17.05 "2003".
17.10 Ортодокс.
17.30 Ноу-хау.
17.45 "Вокзал мечты".
18.15 "Сокровища Петербурга".
18.30 "Шекспир. XX век". "Буря".
19.15 Чудо-сказка.
19.29 Азбука.
19.50 "Документ-панорама".
20.45 После новостей...
21.35 "Потомок белого барса". Худ. фильм. 1-я серия.
22.10 "Петербургские портреты".
22.35 "Из концертного зала". В.-А.Моцарт. Концерт до мажор для фортепиано с оркестром.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Герой дня без галстука.
9.40 "Чистосердечное признание".
10.05 Своя игра.
10.30 Дог-шоу "Я и моя собака".
11.30 "Открытая книга".
13.30 "Скорая помощь" (США).
14.20 "Сегодняшко". Красная стрела.
15.30 "Захватчики" (США).
16.30 Впрок.
16.55 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

12.10 Тяжелый день.
12.35 Бобруйский вариант.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Большой кайф, или Приключения в Новом Орлеане".
18.15 Катастрофы и войны недели.
18.40 Мультфильмы.
19.00 Служба ваших забот.Брак и семья.
19.40, 21.00 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.35 "Больше денег".Комедия.
23.05 День области.
23.15 "Элемент сомнения".Триллер.

2 КАНАЛ

18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Муз. антракт.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Дерзкие и красивые".
19.25 "Удивительные истории".
19.50 "Поздравления".
20.30 Мультфильм.
20.43 "Акапулько".
21.30 Высокая мода.
21.40 Майкл Парэ в боевике "Рассвет".
23.00 Спортивная программа.

•• Среда, 10 февраля ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.25 Новости.
8.00 "Алло, "Событие".
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.35 Видеокурс английского языка.
10.00 "Я рисую".
10.15 Видимо-невидимо.
11.15 "Проклятый уютный дом".
12.00 Око.
12.25 Зорная ростань. Телеконкурс молодых артистов эстрады.
13.15 "Станционный смотритель". Худ.фильм.
14.25 "И дух исполнен терпения, любви..." Док.фильм.
15.15 "Приключения Шерли Холмс".
15.40 Видеокурс французского языка.
16.05 "5 х 5".
16.35 Республиканская заочная физико-математическая и химическая школа.
17.15 "А музыка звучит..." По страницам фестиваля "Славянский базар в Витебске-98".
17.40 "Макаенка,9".
18.10 "Проклятый уютный дом".
19.15 "Сегодня с вами..." Генеральный директор Белгосстраха Виктор Шуст.
19.40 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 М.Мастрояни в худ.фильме "Разрешите познакомиться? Рокко Папалео" (Италия).
23.45 Криминальный хроника.
23.50 Белорусский хит-парад.
23.55 Королевская охота.
0.35 Темная комната. "Бизнес-леди".
1.00 Хоккей. Чемпионат Восточно-Европейской лиги. "Полимир" (Новополоцк) — "Сокол" (Киев).

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Жестокий ангел".
9.15 Тема.
9.55 В мире животных.
10.30 "Храбрец-удалец". Мультфильм.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 "Каспер, который живет под крышей".
14.40 Зов джунглей.
15.05 Детские анекдоты.
15.35 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Жестокий ангел".
17.15 Угадай мелодию.
17.45 Здесь и сейчас.
18.05 Человек и закон.
18.45 Телесериал "Вечный зов".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.50 И.Смоктуновский и В.Проскурин в фильме "Пиковая дама".
22.30 "Разящий бумеранг". Дело 1988 года". Документальный детектив.
23.00 Новость дня.
23.15 Программа "Тихий дом".

"РОССИЯ"

6.00, 8.30, 8.45 Доброе утро, Россия.
8.15 Дежурная часть.
8.35 Телеигра "Программа передач".
8.50 Товары — почтой.
9.00 "Санта-Барбара".
9.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 23.35 Вести.
15.15 Мультфильмы.
15.30 "Первые поцелуи".
16.35 "Башня".
17.00 Компьютер.
17.20 "...Во дни веселий и желаний я был от балов без ума..." Первый Пушкинский бал в Москве.
18.30 Двойной портрет.
19.40 Подробности.
19.50 Сам себе режиссер.
20.25 А.Васильев, Л.Полищук и Е.Жариков в мистической комедии "Ваши пальцы пахнут ладаном".
22.25 "Притворщик".
23.20 Дежурная часть.
0.05 Автошоу.

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.00, 19.30, 23.05 Новости культуры.
7.25 "Документ-панорама".
8.20 К 125-летию со дня рождения В.Э.Мейерхольда. "Загадки "Ревизора".
9.00, 15.00, 17.00 Новости.
9.05 "Потомок белого барса". Худ. фильм. 2-я серия.
10.10 Митрополит Антоний Сурожский.
10.40 "Шекспир. XX век". "Буря".
11.35, 13.45 Шедевры мирового музыкального театра. Дж.Пуччини. "Тоска".
13.29 Азбука.
14.20 Международное обозрение.
15.05 "Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок".
15.35 "Лукоморье".
15.55 Про фото.
16.20 "Без визы".
16.30 "С потолка".
17.05 Экспедиция Чиж.
17.30 "Кто мы?"
17.55 "Брожу ли я вдоль улиц шумных..." А.Битов читает черновики А.С.Пушкина.
18.10 "Документ-панорама".
19.05 Чудо-сказка.
19.29 Азбука.
19.50 Последняя дорога Пушкина.
20.45 После новостей...
21.05 "Потомок белого барса". Худ. фильм. 2-я серия.
22.10 "Александр Володин. Так неспокойно на душе!" Док. фильм.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 В.Шевельков и Н.Вавилова в фильме "Поезд вне расписания".
10.30 Мультфильм "Заячий хвостик".
10.40 "Среда".
11.30 "Открытая книга".
13.30 "Скорая помощь" (США).
14.20 "Сегодняшко". Красная стрела.
15.30 "Захватчики" (США).
16.30 Впрок.
16.55 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

12.00 Служба ваших забот. Брак и семья.
12.35 Портрет коллектива.Белорусский цементный завод.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 Мужской клуб."Жизнь после штампа".
18.15 "Мир скорости".Тележурнал.
18.40 "Как лисица зайца догоняла".Мультфильм.
18.50 Телеприемная.В студии председатель областного суда В.Поленюк.
19.35, 21.00 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.35 "Время умирать".Худ.фильм.
23.05 День области.
23.15 "57 пассажир".Боевик.

2 КАНАЛ

18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Муз. антракт.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Дерзкие и красивые".
19.25 "Случайный свидетель".
19.50 "Поздравления".
20.30 Мультфильм.
20.43 "Пляж".
21.30 Мелодрама "Бедная маленькая богатая девочка". 1 ч.
23.40 Спортивная программа.

•• Четверг, 11 февраля ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.30 Новости.
8.15 "Сегодня с вами..."
8.40 Потребительская корзина.
15.10 "Приключения Шерли Холмс".
15.35 Видеокурс английского языка.
16.00 ТВ — школе.
16.30 Гости в дом.
17.10 Ток-шоу "Карамболь" с участием Влада Сташевского.
17.40 "Боровая — место жительства". Док. фильм.
18.00 "Проклятый уютный дом".
19.15 Политические диалоги.
19.40 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 "Папа". Худ.фильм (Польша).
23.50 Криминальная хроника.
23.55 Белорусский хит-парад.
0.00 Крок. "Путь без следов". Криминал на рынке недвижимости.
0.40 Акколада.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Жестокий ангел".
9.10 Человек и закон.
9.55 Клуб путешественников.
10.40 "Кот и клоун". Мультфильм.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 "Каспер, который живет под крышей".
14.45 Классная компания.
15.05 "Улица Сезам".
15.35 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Жестокий ангел".
17.15 Угадай мелодию.
17.45 Здесь и сейчас.
18.05 "Чтобы помнили..." Валентина Владимирова.
18.45 Телесериал "Вечный зов".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.50 Том Круз и Пол Ньюмен в фильме "Цвет денег".
22.55 Анита Цой в программе "Женские истории".
23.25 Новость дня.

"РОССИЯ"

6.00, 8.30, 8.45 Доброе утро, Россия.
7.20 Торговый дом "Ле Монти".

8.15 Дежурная часть.
8.35 Телеигра "Программа передач".
8.50 Товары — почтой.
9.00 "Санта-Барбара".
9.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 23.20 Вести.
15.15 Сказочный полдник.
15.30 "Первые поцелуи".
16.35 "Башня".
16.55 Компьютер.
17.15 Н.Гундарева, В.Талызина, А.Джигарханян в комедии "Дульсинея Тобосская". 1-я серия.
18.30 Двойной портрет.
19.40 Подробности.
19.50 "Два рояля".
20.40 Ч.Норрис в боевике "Одинокий волк Маккуэйд" (США).
22.35 "Слушается дело". Заседание телевизионного суда присяжных.
23.55 Дежурная часть.
0.10 Горячая десятка.

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.00, 19.30, 23.00 Новости культуры.
7.25 "Документ-панорама".
8.20 "Парадоксы истории".
8.50 Вальсы И.Штрауса.
9.00, 15.00, 17.00 Новости.
9.05 "Перекличка". Худ. фильм. 1-я серия.
10.05 "Золотая ветвь". А.Флоренский.
10.35 Ноу-хау.
10.50 Музыка из Петербурга.
11.40 Поездка Грибоедова к Чаадаеву.
12.00, 13.45 У.Шекспир. "Король Лир". Спектакль Грузинского академического театра им. Ш.Руставели.
13.29 Азбука.
15.05 "Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок".
15.35 "Лукоморье".
15.55 "Пушкин и судьбы русской культуры". Передача 2-я.
16.40 Академия спорта.
17.05 "2003".
17.10 "Российский курьер".
17.50 Новое кино.
18.15 "Кто там..."
18.45 "Время музыки". Тележурнал.
19.10 Чудо-сказка.
19.29 Азбука.
19.50 "Лица врага". Док. фильм (США).
20.45 После новостей...
21.05 Поэтический театр М.Козакова. А.С.Пушкин. "Чудный сон мне Бог послал...".
21.30 Поет Е.Миртова.
21.40 "Перекличка". Худ. фильм. 1-я серия.
22.40 Джазофрения.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 "Мафия в белом халате". Худ. фильм. (Италия).
11.30 "Открытая книга".
13.30 "Скорая помощь" (США).
14.20 "Сегодннячко". Красная стрела.
15.30 "Захватчики" (США).
16.30 Впрок.
16.55 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 Ток-шоу "Я сама". "Это твоя проблема, дорогая..."
18.20 Из жизни женщин.
18.40 "Скарбы". Зимние обрядовые песни.
19.05, 21.00 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.35 "Новобрачные". Комедия.
23.10 День области.
23.20 "Плюшевый мишка". Драма.

2 КАНАЛ

18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Муз. антракт.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Дерзкие и красивые".
19.25 "Чтобы помнили".
19.50 "Поздравления".
20.30 Мультфильм.
20.43 "Пляж".
21.30 Мелодрама "Бедная маленькая богатая девочка". 2 ч.
23.40 Спортивная программа.

•• Пятница, 12 февраля ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе. Изобразительное искусство. 7-й класс.
9.40 Видеокурс английского языка.
10.05 Уроки Н.Новожиловой.
10.30 Телевизионный Дом кино.
11.15 "Проклятый уютный дом".
12.10 Сделано в Беларуси. АО "Стужка" (г.Могилев).
12.25 Королевская охота.
13.15 "Проклятый уютный дом".
14.05 К 95-летию народного артиста Беларуси Д.А.Орлова "Не остановятся часы". Док.фильм.
14.45 Мультфильм.
15.10 "Приключения Шерли Холмс".
15.40 Окружающий мир. Чернобыль и состояние здоровья нации.
16.05 Регион.
16.30 "Риск-версия". Телеигра.
17.15 "А музыка звучит..." "Верасы" — 25 лет.
17.40 Наш край.
18.05 "Проклятый уютный дом".
19.15 "Сегодня с вами..." Председатель Республиканского совета директоров профессионально-технических училищ Валерий Хасин.
19.40 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Е.Яковлева в худ.фильме "Интердевочка".
0.25 Криминальная хроника.
0.30 Белорусский хит-парад.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Жестокий ангел".
9.15 Программа "Человек в маске".
10.00 "Чтобы помнили..." Валентина Владимирова.
10.40 Смак.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 Фильм С.Спилберга "Земля до начала времен".
15.35 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Жестокий ангел".
17.15 Джентльмен-шоу.
17.45 Играй, гармонь любимая!
18.15 Здоровье.
18.45 Поле чудес.
19.45 "Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.50 Коломбо в детективе "Мертвый груз".
22.10 "Песня года." Избранное.
23.05 Новость дня.
23.25 Ж.Депардье в мелодраме "Двое".

"РОССИЯ"

6.00, 7.30, 8.30, 8.45 Доброе утро, Россия.
7.15 Тысяча и один день.
8.15 Дежурная часть.
8.35 Телеигра "Программа передач".
8.50 Товары — почтой.
9.00 "Санта-Барбара".
9.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 22.55 Вести.
15.15 Мультфильм.
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
16.55 Компьютер.
17.15 "Дульсинея Тобосская". 2-я серия.
18.30 Двойной портрет.
19.40 Подробности.
19.50 "Аншлаг" и К°.
20.55 Музыкальный ринг. И.Салтыкова против В.Салтыкова.
22.40 Дежурная часть.
23.30 Комедия "Страшные привычки" (Испания).

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.00, 19.30, 23.00 Новости культуры.
7.25 Консилиум.
7.50 Академия спорта.
8.10 Метаморфозы Юрского периода.
9.00, 15.00, 17.00 Новости.
9.05 "Перекличка". Худ. фильм. 2-я серия.
10.00 "Российский курьер".
10.45 "Закрытая книга". В.Каверин.
11.40 "Без вины".
11.55 Живое дерево ремесел.
12.00 Биатлон. Чемпионат мира. Мужчины. 15 км.
13.00 "Время музыки". Тележурнал.
13.29 Азбука.
13.45 "Домовой". Памяти С.Гейченко.
14.35 Мультфильм.
15.05 "Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок".
15.35 "Лукоморье".
15.50 "Пушкин и судьбы русской культуры". Передача 3-я.
16.35 Ваше сословие.
17.05 "2003".
17.10 "Актер и время". А.Степанова.
18.00 "Джаз: тема с вариациями". Г.Гаранян.
18.40 "Парижский журнал". Р.Гари.
19.05 Чудо-сказка.
19.29 Азбука.
19.50 Видеошедевры режиссера З.Рыбчински. "Четвертое измерение".
20.20 "Рассказы старого сплетника". Передача 2-я.
20.50 После новостей...
21.10 Мгновенье мастерства.
21.40 "Перекличка". Худ. фильм. 2-я серия.
22.35 Pro memoria. "Что есть Я".

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 "Ключи от форта Байяр".
10.30 Телеигра "Поймы меня".
11.30 "Открытая книга".
13.30 "Арина". Программа А.Шараповой.
14.20 "Сегодннячко". Красная стрела.
15.30 "Захватчики" (США).
16.30 Впрок.
16.55 Футбольный клуб.

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

13.10 "Золотой шлягер-98". Заключительный гала-концерт. 2 отд.
16.05 Регион.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Рассказы о животных". Док.сериал.
18.00 "Зима в Простоквашино". Мультфильм.
18.15 "Закон Берка". Сериал.
19.00, 21.10 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 Пунктир.
21.00 Астро-дайджест.
21.45 "Ребенок напрокат". Мелодрама.
23.15 День области.
23.25 Фестиваль восточных единоборств.

2 КАНАЛ

18.00 "Победоносный голос верующего".
18.30 Музыкальный антракт.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.57 Прогноз погоды.
19.00 "Искусство убийства". Телесериал.
19.45 "Поздравления".
20.45 Мультфильм.
21.00 "Альфред Хичкок представляет".
21.30 Высокая мода.
21.40 Комедия "Мышиная охота".
23.20 Музыкальная коллекция.

•• Суббота, 13 февраля ••

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Континент.
8.15 Столица.
8.40 Потребительская корзина.
9.00, 15.00 Новости.
9.10 "Семь маленьких рассказов о первой любви". Худ.фильм (Грузия).
10.15 "Сегодня с вами..." Заведующая кафедрой "Моделирование одежды и художественного текстиля" Белорусской академии Валентина Марковец-Бартлова.
10.40 Здоровье.
11.05 Вершина мира. Телевикторина.
11.30 Компьютерный полигон.
11.55 "Все нормально, мама!"
12.30 Четвертое измерение.
13.00 "Легенда о Вильгельме Телле".
13.55 Книгосбор.
14.25 Олимп.
15.10 Уроки Н.Новожиловой.
15.35 Познай себя.
15.55 Телеочерк о X1X Всемирных зимних играх студентов "Универсиада-99" в Словакии.
16.35 Бон-тон.
17.05 Ток-шоу "Это моя работа".
17.35 КВН. Финал кубка Беларуси.
19.00 Вечер, посвященный памяти поэтессы Евгении Янищиц.
19.40 "Из достоверных источников".
20.05 Бездельник.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Спортлото.
21.50 О.Мутти в худ.фильме "Ради смеха!" (Франция).
23.30 Белорусский хит-парад.
23.45 Видимо-невидимо.

ОРТ

7.00 Худ. фильм "Верность".
8.24 Спонсорство.
8.25 Домашняя библиотека.
8.45 Слово пастыря.
9.00, 14.00, 17.00 Новости.
9.15 Программа "100%".
9.45 "Утренняя почта".
10.20 "Каламбур".
10.50 Смак.
11.10 Возвращение Третьяковки.
11.35 Худ. фильм "Я объявляю вам войну".
13.00 Мультфильм.
13.20 В мире животных.
14.15 Хоккей. Финальные игры Евролиги. "Динамо" (Москва) — "Ильвес" (Финляндия). Трансляция.
14.55 "Икар и мудрецы". Мультфильм.
15.45 "Змей на чердаке". Мультфильм.
17.15 "Ералаш".
17.45 Р.Шнайдер и А.Делон в фильме "Бассейн".
20.00 "Время".
20.50 "Секретные материалы".
22.30 Хоккей. Финальные игры Евролиги. "Металлург" (Магнитогорск) — "Айсбэрен" (Германия).
23.13 Новости спорта.

"РОССИЯ"

7.00 Мультфильмы.
7.15 "Дорога никуда". Фильм для детей.
8.30 Мультфильмы.
9.00 Доброе утро, страна.
9.45 "Сто к одному". Телеигра.
10.30 Любовь с первого взгляда.
11.00 Подиум д'арт.
11.30 Домашние хлопоты.
12.00 "Неделя в Санта-Барбаре".
13.00, 19.00 Вести.
13.30 Неделя власти.
14.00 Лауреаты открытого форума телевидения России "Лазурная звезда": год 1998. Док. фильмы.
14.45 Благотворительный вечер "День преодоления".
16.00 Биатлон. Чемпионат мира. Эстафета 4х7,5 км. Женщины.
17.00 Моя семья.
18.00 "Площадь звезд-99".
19.30 Концерт Надежды Бабкиной.
23.15 Скорость.
23.30 Фильм Ф.Карпи "Гомер. Портрет художника в старости" (Италия).

"КУЛЬТУРА"

9.10 "Читая Библию".
9.20 Книжный кладезь.
9.35 "Необычайные приключения мистера Веста в стране большевиков". Худ. фильм.
10.55 "День рождения". Первый открытый конкурс исполнителей новой детской песни.
11.55 Биатлон. Чемпионат мира. Женщины. Эстафета 4х7,5 км.
14.09 Азбука.
14.10, 21.00 Новости культуры.
14.25 Горе уму.
15.25 Играет ансамбль "Венецианские интерпретаторы".
15.35 "Времена не выбирают..."
16.05 Очевидное - невероятное.
16.30 "Открытие таланта".
17.00 Новости.
17.05 Международное обозрение.
17.45 "Судьба, судьбою, о судьбе".
18.35 "Культура вне границ".
19.15 Чудо-сказка.
19.35 "XX век в кадре и за кадром".
20.25 "15-й подъезд".
20.59 Азбука.
21.20 "Ранние журавли". Худ. фильм.
22.50 Блеф-клуб.

НТВ

7.00 Мультсериал "Битлджус" (США).
7.30 Детектив "Лекарство против страха".
9.00, 11.00, 15.00 Сегодня.
9.15 "Чистосердечное признание".
9.40 Впрок.
10.00 Телеигра. "Пойми меня".
10.30 "Фитиль".
11.15 "Тегеран-99". Фильм из цикла "Новейшая история".
11.40 Своя игра.
12.10 П.Ньюмен и Ш.Рэмплинг в фильме "Вердикт" (США).
14.30 "Русский век".
15.20 "Она написала убийство" (США).
16.15 Суд идет.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Удивительные игры народов мира". Мексика.
18.00 С любовью.
19.00 "Конек-горбунок". Мультфильм.
20.10 С любовью.
21.10 "Неспящие в Сиэтле". Мелодрама.
22.35 Астро-дайджест.
22.45 Диск-канал.
23.15 "Плохой вкус". Черная комедия.

2 КАНАЛ

15.00 "Роковая подмена". Худ. фильм.
16.40 Мультфильмы.
17.00 "Поздравления".
18.00 "Благая весть с Риком Реннером".
18.30 "Поздравления".
19.30 Индийское кино. "Террористы".
21.50 Высокая мода.
21.55 Боевик "Земля полицейских".
23.55 Спортивная программа.

•• Воскресенье, 14 февраля ••

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Документальный сериал "Города мира" (США).
8.30 "Любовь бывает разная..." Поэтично-музыкальная фантазия.
8.40 Потребительская корзина.
9.00, 15.00 Новости.
9.10 Мультфильм.
9.20 "Навстречу".
10.00 М.Равель. "Пробуждение". Балетная миниатюра.
10.10 Туробъектив.
10.35 "Все нормально, мама!"
11.10 Спортивные новости.
11.30 Арсенал.
11.55 Сделано в Беларуси. ОАО "Коммунарка" (г.Минск).
12.10 Марсово поле.
12.25 "АРТ-клуб".
13.05 "Легенда о Вильгельме Телле".
13.55 Сельчане.
14.20 Приглашаем на вечорки.
15.10 "Древо жизни". Телеочерк.
15.35 Семейный телеканал "На волне взаимопонимания".
16.35 Зорная ростань.
17.05 Телебарометр.
17.20 Е.Леонов и В.Кикабидзе в худ.фильме "Совсем пропащий".
18.55 Теленавигатор.
19.15 Стадион.
19.40 Колыбельная.
20.00 Резонанс.
20.50 Ток-шоу "Карамболь" с участием Елены Камбуровой.
21.25 П.Пиллар в худ. фильме "Четверка" (Бразилия).
23.15 Премьера песни.
23.25 Авто-парк.
23.35 Мода для мужчин в программе "Новая коллекция".
0.05 Хоккей. Чемпионат Восточно-Европейской лиги. "Тивали" (Минск) — "Беркут" (Киев).

ОРТ

6.55 Худ. фильм "Златовласка".
8.30 "Дисней-клуб": "Русалочка".
9.00, 14.00 Новости.
9.15 "Непутевые заметки".
9.30 Пока все дома.
10.05 Утренняя звезда.
10.55 Служу России!
11.25 Крестьянские ведомости.
11.55 Биатлон. Чемпионат мира. Эстафета 4х7,5 км. Мужчины.
13.25 Смехопанорама.
14.25 Клуб путешественников.
15.10 Футбольное обозрение.
15.40 "Дисней-клуб": "Тимон и Пумба".
16.05 "Дисней-клуб": "Аладдин".
16.35 "Колесо истории".
17.25 "Ералаш".
18.00 КВН-99. X фестиваль "КИВИН" в Сочи.
20.00 Время.
20.35 Хоккей. Евролига. Финал.
23.05 Новости культуры.
23.20 Комедия "Удар судьбы".

"РОССИЯ"

7.00 Мультфильм.
7.30 Служу Отечеству!
8.00 "Али- Баба и сорок разбойников". Мультфильм.
8.30 Почта РТР.
9.00 Доброе утро, страна.
9.30 Сам себе режиссер.
10.00 "Аншлаг" и К°.
11.00 Русское лото.
11.40 Мир книг.
12.00 "Неделя в Санта-Барбаре".
13.00 Вести.
13.30 Федерация.
14.10 Парламентский час.
15.10 "Закон и порядок".
16.00 Диалоги о животных.
17.00 Старая квартира. Годы 1948 - 1958-й. Часть 1-я.
18.00 Совершенно секретно.
19.00 Зеркало.
20.00 А.Ливанов и Е.Кондулайнен в мелодраме "На Муромской дорожке..."
21.40 А.Володин в программе "Фрак народа". К юбилею драматурга.
22.35 Дежурная часть.
23.00 Звуковая дорожка.

"КУЛЬТУРА"

9.10 "Читая Библию".
9.20 Консилиум.
9.45 "Конек-горбунок". Мультфильм.
10.55 Ток-шоу "Наобум" с С.Шакуровым.
11.25 В тридевятом царстве.
11.50 "Свой среди чужих". Художники-концептуалисты В.Комар и А.Меламид.
12.15, 13.45 "Школа скандала". Спектакль Национального академического театра русской драмы им. Леси Украинки.
13.29 Азбука.
13.30, 21.00 Новости культуры.
14.45 "Дворянские гнезда". Звенигородские усадьбы.
15.05 Тихий вечер.
15.30 "А прошлое кажется сном..."
16.00 А.Скрябин. Симфоническая поэма "Прометей".
16.25 "Парадоксы истории".
17.00 Новости.
17.05 "2003".
17.10 Телевидение — любовь моя.
18.00 "Стихи, сочиненные ночью во время бессонницы". А.Битов читает черновики А.С.Пушкина.
18.10 "Спортивные встречи". П.Буре.
18.35 "Судьба, судьбою, о судьбе".
19.25 Чудо-сказка.
19.40 Этюд на тему "Маскарада".
20.05 "Эти странные музеи". "Хрустальные миры" (Австрия).
20.15 Балет "Пульчинелла" в исполнении балетной труппы Мари Рамбер.
20.59 Азбука.
21.20 "Седьмая печать". Худ. фильм.
22.50 Живая музыка.

НТВ

7.00 "Про Витю, про Машу и морскую пехоту". Худ. фильм.
8.10 Мультфильм "Малыш и Карлсон".
8.30 "Фитиль".
9.00, 11.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Комедия "Сердца четырех".
10.45 Мультфильм.
11.15 Большие деньги.
11.40 Ю.Богатырев и Э.Шикульска в фильме "Объяснение в любви". 1-я и 2-я серии.
14.00 Жизнь замечательных зверей (Великобритания).
14.30 "Русский век". Александр Горшков.
15.25 "Ключи от форта Байяр".
16.40 "Арина". Программа А.Шараповой.

2 КАНАЛ

15.00 "Месть отца". Худ. фильм.
16.35 "Шестнадцатилетние".
17.00 "Поздравления".
18.00 Джойс Майер. "Жизнь в слове".
18.30 "Книга джунглей". Мультфильм.
19.50 "Секретные материалы".
20.35 Мультфильм.
20.40 "Пляж".
21.25 Высокая мода.
21.30 Джек Николсон в триллере "Сияние".
23.55 Спортивная программа.

Нямецкія грошы й пераварот 1917 году



(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарох).

Кайзэраўскія грошы расходваліся ня толькі на правядзеньне сабатажу, але й на друкаваньне ўлёткаў з рэвалюцыйнымі заклікамі. У адным з дакумэнтаў з нумарам 5822, які захоўваецца ў міністэрстве замежных справаў Нямеччыны, гаворыцца: «Неабходна расплаціцца з друкарняй, дзе на наступным тыдні будзе надрукаваны ўвесь наклад улёткаў на расейскай мове, а таксама заплаціць за йіхняе транспартаваньне».

Натуральна, у Гэльфанда й Ганецкага ёсьць свая філія і ў Стакгольме. Бальшыня тавараў, якія марскім шляхам пастулалі ў Стакгольм і Кабэнхаўн, перагружаліся на йіншыя караблі й скіроўваліся далей у Расею. Там іх прадавалі, а выручка паступала на банкаўскія рахункі фірмы ў Швэцыі й Даніі. Потым грошы адмываліся й пераводзіліся ў пэтраградзкую філію Сібірскага банку на рахунак адваката Казлоўскага. Той, у сваю чаргу, усе гэтыя грошы ўносіў у партыйную касу.

Для таго, каб замесьці сьляды, Гэльфанд і Ганецкі атрымлівалі крэдыт ад Дойчэ Банку. Міністэрства замежных справаў Нямеччыны, якое было асноўным фундатарам фірмы, потым вяртала гэтыя грошы банку.

Амаль на тысячу кілямэтраў працягнулася чыгунка ад Стакгольму да прыпамежнага гарадку Хапаранда на поўначы Швэцыі. Амаль такую ж адлегласьць трэба пераадолець па тэрыторыі Фінляндыі, каб потым трапіць у Пэтэрбург. У годы Першае сусьветнае вайны гэты маршрут быў асноўнай транспартнай артэрыяй для ўсіх тых, хто якім бы то ні было чынам быў далучаны да рэвалюцыі ў царскай сталіцы. Празь мяжу правозілася ўсё неабходнае для падрыхтоўкі дню «Х»: улёткі й брашуры, кнігі й газэты, зброя й выбуховае начыньне й, натуральна, грошы.

Улічваючы важнасьць гэтага маршруту, нямецкія стратэгі пры садзейнічаньні свае амбасады ў Стакгольме ўздоўж усяе працягласьці чыгуначнага шляху выставілі сваіх людзей. Яны мусілі забясьпечваць бясьпеку перапраўкі ў Пэтраград усяго нелегальнага й рэвалюцыйнага. Ад іх дапытлівага позірку не магла схавацца ніводная дробязь. Нямеччына шчодра ўзнагароджвала гэтых людзей за йіхнія паслугі. Так, нейкі Кляйн, які працаваў на Стакгольмскім вакзале, за садзейнічаньне ў перапраўцы рэвалюцыйнае літаратуры ў Расею, атрымліваў ад Нямеччыны, як гаворыцца ў дакумэнтах нямецкага МЗСу, 300 рэйхсмаркаў штомесяц. Расейскаму агэнту Лічаву было выплачана 6.000 рэйхсмаркаў за арганізацыю адмысловага бюро непадалёк ад Хапаранды. 100.000 рэйхсмаркаў пайшлі на рахунак фінляндыйскага стацкага дарадцы за ягоныя шчыраваньні, накіраваныя на адасабленьне Фінляндыі ад Расеі.

У Нямеччыне з палёгкай усьпрынялі стрэл «Аўроры», які стаўся знакам для бальшавікоў на пачатак штурму Зімняга. Бо кайзэраўскія стратэгі разьлічвалі ня толькі на тое, што Расея выйдзе з вайны, яны спадзяваліся, што цяпер нарэшце назаўсёды можна будзе перакрыць і грашовы кран, зь якога спатольвалі сваю фінансавую смагу расейскія рэвалюцыянэры. Але такія надзеі апынуліся марнымі. Новая ўлада ў Расеі так і ня здолела скарыстацца грашыма ўраду Керанскага, паколькі скарбонка была пустая. Мара Гэльфанда пра тое, што за 20 мільёнаў рублёў можна будзе цалкам фінансаваць рэвалюцыю ў Расеі, апынулася толькі марай. Нямецкія дакумэнты, датычныя Расеі й складзеныя пасьля 1917 году, як адзначаюць Ёхэн Траўптман і Гэрхард Шысэр, нагадваюць бугалтарскія справаздачы.

Не прайшло й двух тыдняў пасьля прыходу да ўлады бальшавікоў, як нямецкі амбасадар у Расеі з заклапочанасьцю паведаміў у Бэрлін пра тое, што ленінскаму ўраду даводзіцца змагацца з моцнымі фінансовымі цяжкасьцямі. Ён параіў тэрмінова аказаць бальшавікам грашовую дапамогу. У зьвяз з гэтым амбасадар нямецкага кайзэра ў Швайцарыі фон Бэргэн зьвярнуўся з просьбай да статс-сакратара казначэйства ў Бэрліне: «Рэпрэзэнтаваць міністэрству замежных справаў з мэтай правядзеньня палітычнае прапаганды ў Расеі 15 мільёнаў маркаў».

Ужо на наступны дзень паступіла пацьверджаньне пра выдзяленьне гэтых грошай, якія былі выплачаныя новаму ўраду бальшавікоў. Але й гэтае сумы не хапіла. Першы амбасадар Нямеччыны ў Савецкім Саюзе граф Мірбах вымушаны марнаваць куды большыя грошы на тое, каб перадухіліць аднаўленьне зьвязу цяпер ужо Савецкае Расеі з Антантай. «Гэта каштуе грошай, – скардзіцца ён адкрыта. – І немалых грошай».

Тымчасам фонд, які меў у сваім распараджэньні Мірбах, пачаў таяць. Таму ён прапанаваў стварыць новы фонд памерам у 40 мільёнаў маркаў. 15 чэрвеня 1918 году міністэрства замежных справаў Нямеччыны атрымала адказ ад скарбніцтва: «Дарагі спадар Кульман. Адказваючы на Ваш ліст ад пятага дню гэтага месяца пад нумарам АС 2562, у якім размова йдзе пра Расею, я выказваю гатоўнасьць, не патрабуючы ніякіх дадатковых тлумачэньняў, рэпрэзэнтаваць 40 мільёнаў маркаў. Граф Рэндэн».

У жніўні 1918 году Ленін накіраваў дэпешу свайму амбасадару ў Швайцарыі з наступным зьместам: «Бэрлінцы й надалей мусяць дасылаць нам грошы. Калі гэтыя мярзотнікі будуць зацягваць, тады паскардзіцеся мне».

(Заканчэньне ў наступным нумары)



Самыя небясьпечныя гарады

Найбольш экалягічна бруднымі гарадамі, як і дзесяць гадоў таму, застаюцца Магілёў і Наваполацак.

Як паведаміў падчас выступу на калегіі абласнога камітэту прыродных рэсурсаў і навакольнага асяродзьдзя «профільны» міністар Міхаіл Русак, у нашым горадзе найбольшую шкоду прыносяць хімічная індустрыя і аўтатранспарт. Абласному цэнтру не стае ачышчальных збудаваньняў і ўкараненьня прыродаратавальных тэхналёгіяў. Прычына трывіяльная – няма сродкаў.

Старадаўняй музыкі кранальныя матывы

Канцэрт, да якога дадалі прыемнае азначэньне – гутарка, прайшоў у камэрнай залі дзяржуніверсітэта імя А.Куляшова. Ён называўся «Старонкі старадаўняй беларускай музыкі».

У праграме прагучалі фрагмэнты са старажытнага «Полацкага сшытку», арыі з опэраў Станіслава Манюшкі па п'есах Дуніна-Марцынкевіча, творы геніяльнага Агінскага й іншых беларускіх кампазытараў мінулых часоў. Зьмястоўная, кранальная для кожнага патрыёта свайго краю вечарына была наладжаная катэдрай мэтодыкі музычнага выхаваньня ўнівэрсітэту.

Залатая рыбка

У магілёўскіх крамах рэзка зьнізіўся продаж рыбы. Падзеньне па розных гатунках складае да 50% і вышэй.

Прычыны цалкам зразумелыя. Кошты на прамысловую рыбу ўзрасьлі настолькі, што ўся яна сталася «залатой». У той жа час некуды падзелася свая рыба, якую так пасьляхова вырошчвалі ў спэцыяльных гаспадарках у Асіповіцкім, Магілёўскім, Бялыніцкім раёнах і нават – на штучных саджалках аб'яднаньня «Хімвалакно». Але-ж ці адна толькі рыба сплыла ад «рынкавага сацыялізму»?!

Кроніка
Івана ЗАСАДЫ

«Я б хацеў плаціць падаткі...»

Сёньняшні наш госьць – прадпрымальнік са «Спартака». Мы размаўлялі даволі працяглы час. Хацелася даведацца, што прымушае яго й сёньня не кідаць свайго занятку, які ў вачах дзяржавы выглядае амаль крымінальным. Вы зразумееце гэта, прачытаўшы матэрыял далей. Я б акрэсьліў даволі каротка мэту і надзею майго суразмоўцы – жаданьне самастойнасьці і свабоды.

– Як атрымалася так, што я патрапіў у прадпрымальнікі? Пасля службы ў войску я пайшоў працаваць на «Строммаш». Гэта быў канец 80-х. Памятаеш, тады ўпершыню на нашай памяці пачалі імкліва расьці цэны, заробкі пераўтвараліся ў пустыя паперкі, за якія нічога не набудзеш. І тут зьявілася магчымасьць самому зарабіць на пражыцьцё – я маю на ўвазе паездкі ў Польшчу, дзе можна было выгадна прадаць нейкія мясцовыя рэчы. Сюды мы везьлі сапраўдную валюту, тавары лепшай якасьці. Тады ў краіне ўпершыню зьнікла такая рэч, як дэфіцыт. Узгадай, у той час ледзь не палова насельніцтва так ці йнакш была зьвязана з падобным чаўночным бізнэсам. І гэты бізнэс зьнімаў зь дзяржавы тое, што яна ўсё адно ня здолела б зрабіць. Дарэчы, у той час дзяржава амаль не перашкаджала маёй дзейнасьці. Хоць, канешне, агульнавядомых глупстваў хапала й тады. Ужо існавала наша зьняважлівая мытня, празь якую ніхто бяз жаху не праходзіў. Да сустрэч зь беларускімі памежнікамі рыхтаваліся як да бітвы з ворагам. Прытым, што ніякімі злодзеямі мы не былі.

І ведаеш, пасьля ўсіх выпрабаваньняў я ўжо ня мог нават умоўна пагадзіцца ісьці «на завод». Гандаль у нармальных умовах – неабходны. Людзям ёсьць што набываць. Але наша эканоміка не дае ім гэтага. А мы давалі й даем. Значыць, мы патрэбныя.

Цяпер посьпех бізнэсу палягае ў неабходнасьці падманваць дзяржаву. Хаця лепш было б сказаць – умела адказваць на падманы самой дзяржавы. Быць шчырым зь ёю немагчыма. Яна сама ставіцца да нас як да злачынцаў па вызначэньні.

Можна ўзгадаць, напрыклад, апошнія два гады. Чаго толькі каштавалі ўведзеныя «задні ходам» падатковыя зборы! У 97-м дзяржава сказала нам: калі будзеце плаціць фіксаваную стаўку, то больш нічога з вас ня возьмем. Многія паверылі й пачалі адзначаць у фінансовай справаздачы ўсе вынікі свайго гандлю. А праз год урадавыя чыноўнікі паведамілі, што, аказваецца, у тых абяцанках штосьці было няправільнае. А каб усё стала правільна, вось вам новыя інструкцыі. І па іх я, напрыклад, мусіў знайсьці недзе 2.000$. А адкуль і за што? Я не багацей. Большасьць з нас не багацеі. Перад намі паўстала дылема: альбо мы дамагаемся адмены новаўвядзінаў, альбо адмаўляемся ад такой працы. Каб тады ў страйках, пікетах, іншых акцыях пратэсту не перамаглі (хай і часткова, і часова), «Спартак» быў бы сёньня пусты.

Тая барацьба дапамагла нам адчуць сваю моц. Але тады-ж усе яскрава ўбачылі – нельга верыць гэтай саўковай уладзе. Бо падобныя выпадкі сталі сумнай традыцыяй. Можна ўзгадаць гісторыі з сэртыфікацыямі, стандартызацыямі, ліцэнзаваньнем усяго на сьвеце. Зараз у падатковых інспэкцыях ніхто не зьдзіўляецца, калі прадпрымальнікі пішуць, што ў іх нулявы даход. Ніхто з таго не сьмяецца. Усе ўсё разумеюць.

Зразумела, што я б хацеў весьці сваю справу, мець даход і плаціць зь яго падаткі. Тады мяне можна было б называць і камэрсантам, і сярэдняй клясай. А зараз ня так. І самае сумнае, не відаць пэрспэктывы. Толькі нейкая яміна перада мной. Я, да прыкладу, ня маю грошай каб адправіць хворага сына да мора, як таго патрабуюць мэдыкі. А нам кажуць: вы багатыя, з вас трэба дзесяць скураў зьняць...

Многія зараз думаюць, каб падацца на заробкі ў Польшчу і далей. Хай сабе і нелегальныя, хай непрэстыжныя. Усё роўна, з тым бардаком, які йснуе сёньня на вытворчасьці, нам няма чаго там шукаць. І шчасьце, і дабрабыт усё адно ў нашых руках.

Запісаў
Сымон ГЛАЗШТЭЙН

НАШ ГОРАД У ГІСТОРЫІ

З кім дзяліўся Магілёў сваёй назвай (артыкул чацьвёрты)

Магілёўскае шкло

Гэта вырабы XVII-XIX стст. Бязколерны й каляровы сталовы посуд (зялёны, сьветла-зялёны, жоўты), пасудзіны для захаваньня вадкасьцяў і лекаў выраблялія шляхам выдзіманьня ў формы (галоўным чынам бутэлькі), і т.зв. халяўным мэтадам. Бутэлькі выраблялія цыліндрычныя, з высокімі канічнымі шыйкамі, аздобленымі вакол рыльцаў адзінарнымі або двайнымі жгутамі ці стужкамі. Вырабы XIX ст. часта аздабляліся пячаткамі з надпісамі. Бутлікі мелі паддоны і высокія вузкія шыйкі, бутлі й збаны былі шара- і грушападобнай формаў, кварты пераважна мелі прамыя плечукі. Шкляніцы, чаркі, шклянкі, ды іншыя ўзоры магілёўскага шкла масава вывозіліся на продаж.

Цяпер фрагмэнты й вырабы магілёўскага шкла трапляюцца дасьледчыкам падчас археалягічных экспэдыцыяў. Яны шырока прадстаўленыя ў грамадзкіх і дзяржаўных музэях.

Магілёўскі строй

Гэта традыцыйны комплекс беларускага народнага адзеньня ў Падняпроўі. Бытаваў у XVIII-пачатку XX ст. пераважна ў Магілёўскім, Быхаўскім, Шклоўскім, Слаўгарадзкім і Рагачоўскім раёнах.

Летні жаночы гарнітур складалі ў асноўным 2 варыянтыкомплексы: кашуля, спадніца, фартух; кашуля, фартух, гарсэт. Арнамэнт вышыўкі быў чырвоны з украпінамі чорнага, кампанаваўся ў палосы на плечавых устаўках і рукавах, на каўнярах. Пераважалі геамэтрычныя (ромб, крыжык, зорачка) і расьлінныя (васількі, бярозка) ўзоры. Андарак (спадніца) быў чырвона-малінавым зь белай, зялёнай, сіняй ці чорнай клеткай. Гарсэт шылі з чырвонага, сіняга аксаміту. Жанчыны насілі на галаве наміткі, альбо хусткі, аздобленыя вышыўкай.



У мужчынскіх кашулях багата вышывалі манішку. Галаўны ўбор – каўпаковая зь лямцу магерка ці футраванка. У музэях магілёўскія строі прадстаўленыя рэчамі XIX стагодзьдзя.

Магілёўскія ручнікі

Гэты тып традыцыйных тканых ручнікоў з Касьцюковіцкага, Краснапольскага, Хоцімскага, Бабруйскага, Кіраўскага й іншых раёнаў вобласьці. Вядомы з XVIII ст. Ткалі зь льняных і баваўняных нітак, даўжынёю 300-450 см, шырынёю 35-40 см, арнамэнт складаў 30-80 см на кожным канцы. Вышываліся чатырохкутнік, ромб, крыжык, трохкутнік, зорачка ды інш. На канцах ручнікоў белыя карункі (часам чырвоныя) з кутасамі. Іхная кампазыцыйная структура дала падмурак сучасным вышываным ручнікам, у якіх арнамэнтальныя палосы, вышытыя крыжыкам, чаргуюцца з палосамі карункаў. Магілёўскія ручнікі ў вялікай колькасьці захоўваюцца ў музэях і прыватных зборах.

Ігар ПУШКІН



На фота: *жанчына зь вёскі Любонічы ў магілёўскім строі.*

БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ

Пра што сьпявалі, пра што марылі Беларускія сыны

«ТМ» працягвае публікацыю тэкстаў песень беларускага антыбальшавіцкага супраціву 1918 – пачатку 1950-х гадоў. Мы не падаем імёны аўтараў, як і не ўдакладняем іншыя акалічнасьці, што тычацца гэтых песень. Мы хочам, каб чытачы проста ведалі, што гэтыя словы сьпявалі тыя, хто загінуў за свабоду нашага Краю.

ШТУРМОВЫ ЗЬВЯЗ

Чутны гоман, там войска сьпявае,
Па садох адгалоскі чуваць –
Крывічанскі жаўнер прыбывае,
Каб сабе тут начлегам стаяць.
Гэта йдзе першы зьвяз наш штурмовы
Беларусь – родны край – бараніць,
Хоча скінуць чужыя аковы,
Ў родным краю каб вольнымі жыць.
Людзі краскамі іх абкідаюць,
А дзяўчаты цалункі ім шлюць.
Яны з радасьцяй гэта прымаюць.
Так прыгожа праз сёлы ідуць.
Па гаспадах гаворкі, цалункі,
Прысяганьні, ў вачох поўна сьлёз –
Вось якія нам будуць жаданьні.
Што рыхтуе нам будучы лёс.
Крывічанскае войска сьпявае,
У крывавы рыхтуецца бой.
А дзяўчына жаўнера пытае,
Чаму браць ён не хоча з сабой.

У ГУШЧАРАХ

У гушчарах, затканых імглою,
Шэрым зьвяркам на золку ў зару
Ахвяруем Табе мы сабою
Кожны дзень, кожны час, Беларусь.
І няма ў сэрцах жалю ні страху,
Мы адвагай жаўнерскай гарым.
Не чужыя, варожыя сілы,
Але Ты нас вядзеш да зары.
Хмарай дым над галовамі тае,
Вецер дыхае мятай, быльлём.
Беларусь, Беларусь залатая,
За Цябе, за Цябе мы ідзём.

НАШ РОДНЫ КУТ. ДЗЕНЬ У ГІСТОРЫІ

4 лютага

1590 год. Атаман вольных казакаў Мацюша Фёдаравіч з 500-мі казакамі напаў на маёнтак магнатаў Хадкевічаў у Быхаве.

1746 год. У Магілёве адбыўся буйны пажар. Распачаўся ён ад жыдоўскага дому, што стаяў ля шынка.

1826 год. Імпэратар Мікалай I выдаў загад аб будаўніцтве крэпасьці ў Бабруйску.

1933 год. У тэлеграме ОГПУ аб стане турмаў узгадваецца турма ў Магілёве (была зьнішчаная ў другой палове 30-х гадоў). Цяпер на яе месцы Дом Саветаў.

5 лютага

1709 год. З Магілёву ў Варонеж да Пятра I паехалі паслы са зваротам, каб той дазволіў адбудаваць Магілёў, што быў зруйнаваны па яго-ж загаду ў 1708 г. Прасілі аб абароне ад рабункаў расейскага войска.

1917 год. У Магілёве імпэратару Мікалаю II быў прадстаўлены даклад «Аб стане харчовай справы ў Санкт-Пэтэрбургу».

6 лютага

1654 год. Войска ВКЛ на чале зь гетманам Радзівілам уначы штурмавала Магілёў, заняты расейскім войскам.

1655 год. Войска ВКЛ на чале з Радзівілам заняла вонкавы земляны вал вакол Магілёву, але ня здолела вызваліць увесь горад ад маскоўскага войска.

1919 год. У Магілёве падняў паўстаньне мясцовы каравульны батальён.

7 лютага

1917 год. У Магілёве імпэратару Мікалаю II быў зроблены даклад наконт «Шырокага распаўсюджаньня сьпіртовых сурагатаў: лакаў і паліторы ў Расеі».

8 лютага

1605 год. Кароль Сыгізмунд III перадаў пад юрыдыкт магілёўскага фарнага касьцёлу вёскі, якія ўваходзілі ў склад Магілёўскай воласьці, а менавіта Еўдакімавічы, Заходы, Церахавы Пруды, Кострыцы.

9 лютага

1835 год. У Мсьціслаўскім павеце нарадзіўся вядомы мастак і скульптар М. Мікешын (памёр у 1896 г.).

1897 год. Адбыўся I Усеагульны перапіс насельніцтва Расейскай імпэрыі. У Магілёўскай губэрні жылі 1.708.441 чалавек. Зь іх у Магілёве – 43.106 чалавек, Шклове – 10.600, Мсьціслаўе – 8.467, Горках – 6.730, Ст.Быхаве – 6.354, Чавусах – 5.550, Чэрыкаве – 5.250, Прапойску – 1.000, Хоцімску – 1.000 чалавек.

10 лютага

1906 год. Акруговы ваенны суд пакараў сьмерцю 13 удзельнікаў выступленьня салдат і матросаў Бабруйскага бальёну.

1938 год. У гэты дзень, а 15 гадзіне, ў складзе групы з 40 чалавек сталінскімі чэкістамі быў растраляны клясык беларускае літаратуры Максім Гарэцкі.

Падрыхтавалі Аляксандар АГЕЕЎ, Ігар ПУШКІН

Паны б'юцца, а ў халопаў чубы трашчаць...

Па сутнасьці такая сытуацыя склалася ў Крычаве. У трэцім нумары мясцовай «раёнкі» (ад 16 студзеня б.г.) быў надрукаваны Адкрыты ліст кіраўніка райвыканкама да старшыні абласнога камітэта дзяржаўнага кантролю сп. Соца. Праз газэту вэртыкальшчык скардзіцца народу на тое, што дзяржаўныя кантралёры наклалі штраф на шэраг прадпрыемстваў і установ, якія працавалі на карысьць раёну.

Сутнасьць канфлікту заключаецца ў тым, што ўлетку па рашэньню райвыканкама прадпрыемствам далі сродкі на добраўпарадкаваньне горада. Гэтыя работы праводзіла ДБУ-20. Каб пачаць гэтыя работы, старшыня райвыканкаму А. Сіваеў, як гаворыцца ў лісту (выдзеленыя цытаты падаюцца на мове арыгіналу – «ТМ»), *«на коленях уговаривал директора областного предприятия «Вторчермет» М.И.Бондарева и начальника Могилёвского отделения Бел. ЖД В.М.Лаптинского, чтобы они помогли бедному Кричеву. И благодарен за их поддержку и понимание».*

Аднак, калі ўсе работы былі зробленыя, ад службы дзяржкантролю прыйшла іншая «падзяка» ў выглядзе штрафных санкцыяў. Гэтыя парушэньні вынікалі з пастановы Саўміна РБ ад 31 жніўня 1993 года № 583. У пятым пункце гэтай пастановы гаворыцца аб тым, што на ўсе работы будаўнічага комплексу патрэбная праектна-каштарысная дакумэнтацыя. Яе кошт узаконены прыблізна ў 30% ад каштарыснай вартасьці. Грунтуючыся на гэтай пастанове, дзяржаўныя кантралёры аштрафавалі 9 прадпрыемстваў і арганізацый горада і раёна, што парушылі гэтае патрабаваньне, на агульную суму 1.500,8 млн. рублёў.

Разьюшаны такой несправядлівасьцю старшыня райвыканкаму задае са старонкі газэты С.Соцу такое пытаньне: *«Скажите, какой ИДИОТ после этих штрафов вложит хоть один рубль в благоустройство? Может, я чего-то не понимаю или до меня не доходит, но я и мои коллеги считаем, что это вредительство и подрыв местной власти накануне выборов».*

А што? Магчыма, гэта сапраўды так.

Лявон СЬВЕЦІК

ЦГС: ПРАЕКТ «ДЗЕЦІ – ДЗЕЦЯМ»

Мастацтва маленькім не бывае

Гэткіх цёплых слоў падзякі ад дзяцей і бацькоў, ад выхавальнікаў і кіраўнікоў дзіцячых установаў у Валяньціны Сьцяпанаўны Нізаўцавай набралася ўжо тоўстая папка. Хто ж яна, гэтая дабрадзейка? Кіраўнік адзінага ў Магілёве самадзейнага дзіцячага лялечнага тэатра, які працуе пры цэнтры дзіцячай і юнацкай творчасьці Ленінскага раёна.

Амаль дзесяць гадоў працуе гэты тэатар. Яго акторамі становяцца дзеці актыўна непаседлівага ўзросту (8-10 год), вучні пачатковых клясаў навакольных школ, якія з захапленьнем гуляюць зь лялькамі, увасабляючы праз чароўны лялечны сьвет свае казачныя мары-фантазіі. Нехта, падрастаючы, знаходзіць іншае прымяненьне сваім здольнасьцям, а некаторыя застаюцца надоўга, да канца школы, бо ўрэшце ўсьведамляюць (ці адчуваюць), што гэта ня проста забавы зь лялькамі, а мастацтва, якое можна ўдасканальваць бязьмежна, праз якое можна спасьцігаць таямніцы прыгожага й законы гармоніі натуральнага сьвету. Тым болей, што ёсьць у Магілёве цудоўны арыеньцір: высокапрафэсійны і непаўторны лялечны тэатар Алега Жугжды.

В.Нізаўцава – таленавіты пастаноўшчык. Яна аддае сваім выхаванцам свае сілы й энергію, каб дапамагчы ім, гэтым маленькім гарэзам і няўмехам, засвоіць азбуку акторскага майстэрства. І калі тыя (бывае, што праз крыўды й сьлёзы, але й праз радасьці посьпехаў) набываюць пэўны спрыт і спэктакль-казка больш-менш выразна вымалёўваецца, іх выпускаюць з падрыхтаванай дзеяй на публіку. Бо што такое тэатар бяз публікі?

А публіка – таго-ж узросту. Яна натуральна ўжываецца ў ход казкі і бурна-эмацыйна рэагуе на яе падзеі. І радасьць посьпеху падзяляецца ўсімі (і артыстамі, і гледачамі) шчыра і непрыхавана. Таму і хваляваныні артыстаў перад пачаткам непадробныя. Але гэтыя хваляваньні, узрушваючы глыбіні душы, урэшце й вядуць да майстэрства. Без такіх хваляваньняў перад гледачамі актор не расьце, не разьвіваецца. Таму выезды са спэктаклямі ў дзіцячыя аўдыторыі – гэта норма йснаваньня дзіцячага тэатра.

Так раней і было. Транспарт і ўсё неабходнае для выездаў забясьпечваў раённы аддзел адукацыі. Але час зьмяніўся ня ў лепшы бок. Зьбяднела дзяржава, зьбяднелі й яе адукацыйныя службы. Не на кішэні стаў аўтобус і паліва для яго. Выезды спыніліся. У грамадзтве з хворай маральлю складанасьці жыцьця адбіваюцца найперш на самых неабароненых.

Тэатар, пазбаўлены жыватворнай цеплыні ўдзячных гледачоў, із суперажываньня, тэатар, зацінуты ў сьценах свайго «цэнтра», пачаў задыхацца, чэзнуць. Акторы браліся развучваць новыя ролі без настрою, безь інтарэсу. Валяньціна Сьцяпанаўна пачала падумваць аб закрыцьці тэатра. Жэстам адчаю стаў яе зварот па дапамогу ў магілёўскі Цэнтар грамадзкіх сувязяў, які аб'ядноўвае некалькі найбольш уплывовых грамадзкіх арганізацыяў.

Жэст адчаю стаў крокам надзеі. Неяк знайшоўся аўтобус і паліва для яго, знайшлася невялікая сума грошай на аплату шафёру і падарункі для маленькіх артыстаў. Праект «Дзеці – дзецям» запрацаваў. Спэктаклі «Вясёлыя гісторыі», «Три поросёнка», «Дзед і жораў» паглядзелі і выхаванцы дзіцячых садкоў, і часовыя затрыманцы спэцпрыёмніка-разьмеркавальніка, і дзеткі ў шпіталях.

Восем выездаў вясной мінулага года, яшчэ шэсьць – як калядныя падарункі – цяпер. У вясновых спэктаклях з батлеечнай беларускай казкай «Дзед і жораў», якая так спадабалася дзецям, удзельнічалі самыя вопытныя і таленавітыя акторкі тэатра, адзінаццацікласьніцы 25-й школы Іра Кучура і Алена Гарачая. Астатнія спэктаклі паказвалі із маладзейшыя сяброўкі й пасьлядоўніцы Насьця Бачкова, Вольга Булыга, Даша Ефіменка, Ксеня Кур'ян, Юля Петрушэўская, Аня Сьвірыдзенка, Яна Сьвірыдовіч, Жэня Сталярова. Тая папка з водгукамі, пра якую гаварылася спачатку, ёсьць ацэнкай іх артыстычнага таленту і ўменьня пераадольваць цяжкасьці, бо іграць даводзілася ў самых непрыстасаваных памяшканьнях, нярэдка без дэкарацыяў, у халодных залях і да т. п.

Праект «Дзеці – дзецям» завершаны. Завершаны ў тым сэньсе, што грошы, выдзеленыя на яго рэалізацыю, вычарпаныя. І што далей? Натхненьня, атрыманага ад эмацыйных кантактаў з гледачамі, артыстам хопіць, мабыць, на бліжэйшыя паўгады. Далей тэатар працягне чэзнуць, бо цяжка спадзявацца, што райаддзел адукацыі ў сучасных варунках пабагацее на аўтобус і на паліва для яго. А тэатру яшчэ трэба касьцюмаў, дэкарацыяў, рэквізыту, нарэшце гэрояў казак – лялек ці хаця б матэрыял для іх вырабу (большасьць лялек акторы шыюць самі). Усё гэта каштуе грошай. Калі яны ня знойдуцца, тэатар загіне. І тады Дэяніс, Саша, Аня і шмат іншых дзяцей не дачакаюцца новых спэктакляў.

Не дачакаюцца?..

Анюта СЁМІНА

Мне спадабаўся спэктакаль «Три поросёнка», усім рабятам было вельмі цікава, і мы вельмі хочам, каб яны прыехалі яшчэ раз, а то нам вельмі сумна. Пархімовіч Дэяніс.

Мне спадабаўся спэктакаль, асабліва Дзед. Саша Дземянкоў, 7 год.

Мы будзем чакаць іншы спэктакаль. Прыяжджайце як мага хутчэй. Аня.

Калектыў дзяцей і выхавацелі НДІЭПП зь вялікай цікавасьцю паглядзелі спэктакаль. Мы былі прыемна зьдзіўленыя прафэсійным майстэрствам дзетак-актораў. Мы вельмі ўдзячныя арганізатару акцыі «Дзеці – дзецям» Нізаўцавай В.С., якая на працягу двух гадоў разам са сваімі акторамі дорыць нашым дзецям радасьць сваёй творчасьці. Хацелася б, каб сяброўства паміж дзецьмі мела працяг, бо хворыя дзеці з аграмадным задавальненьнем прымаюць гасьцей, тым больш што маюць вялікі недахоп падобных зносінаў.





Шолам Алейхэм – Мір Вам !

У Магілёве прайшоў канцэрт «Хасыдзкае капэлы», мужчынскага хору з Масквы. Напярэдадні некалькі розных людзей казалі мне, што пачую са сцэны нешта незвычайнае. Мяне рыхтавалі да сустрэчы з цудам.

Усю паўтарагадзінную праграму хора я чакаў гэтага цуду. Але замест яго пачуў нешта іншае, вышэйшае. Цуд сьведчыць пра несапраўднае. А тыя сьпевы, што гучалі са сцэны, распавядалі пра жыцьцё, пра людзей, пра пёс народу, пра зямлю, якую ва ўсім сьвеце называюць абетаванай. Гэта гучала самое жыцьцё. Ва ўсёй сваёй непаўторнасьці, рэальнасьці і парадаксальнасьці. Розныя мэлёдыі й розныя песьні гучалі ў гэты вечар. Іх яднала вялікае каханьне. Шолам Алейхэм – Мір Вам, формула гэтага каханьня, пераўтваралася раз за разам у музычны напой, які піла амаль запоўненая заля з натхненьнем і радасьцю!

Я бачыў знаёмыя габрэйскія твары, я бачыў сяброў – не габрэяў. Але найперш адчувалася агульная скіраванасьць душаў паўтысячы чалавек да таго прыгожага, што пераадольвае любую нацыянальную, культурную абмежаванасьць і пераўтвараецца ў агульначалавечы набытак, не губляючы пры гэтым сваіх каранёў.

І нішто не гублялася ў гэтым хоры зямной, чалавечай еднасьці. Габрэйскае засталося габрэйскім. І калі я чуў матывы равінскіх сьпеваў, перад вачыма паўставалі карціны 40-гадовых блуканьняў па Сынаі, Халакост, апошні Сыход на вялікую Радзіму. Слухаючы гучны і глыбокі голас кантара Санкт-Пэтэрбурскай сінагогі Боруха Фінкельштэйна, я бачыў і чуў Сьцяну плачу, адчуваў сьпякоту Ершалаімскага сонца. А хасыдзкія песьні, якія хтосьці спросьціў да вызначэньня «вясёлыя», нагадалі мне пра карціны Марка Шагала, апавяды Шолама Алейхэма і ўспаміны маёй бабулі, яе Чэрнеўку. Так, яны вясёлыя. Але іх вясельле прадзіраецца скрозь сьлёзы пагромаў і выганьняў. Ды й сумныя, хоць той сум гучыць скрозь сьмех і жарты. А хутчэй за ўсё, проста па-жыцьцёваму мудрыя. Памятаеце: «Многія радасьці, многія смуткі...»

Але-ж і негабрэйскае засталося такім, якім ёсьць. Адна з пэрлінаў праграмы – старажытнагрузынскі й адзін з самых ранніх хрысьціянскіх сьпеваў у выкананьні Гіі Бешыташвілі. Толькі спыніў пяяньне музыка, а людзі яшчэ працягвалі маўчаць і слухаць цішыню. Бо ў ёй мроіліся грузынскія сьнегавыя вяршыні й лунала дымка нябеснай вышыні.

І ўсё-ж зноў скажу – не было цуда. Было мастацтва самага вышэйшага гатунку. Былі воклічы «Браво!» і «Біс!», былі кветкі і словы ўдзячнасьці. А яшчэ было нешта такое, пра што і сказаць цяжка. Нейкае адчуваньне, нейкая музыка, мэлёдыі, якія гучаць і гучаць дагэтуль у душы...

Сымон ГЛАЗШТЭЙН






Рэдактар Генадзь СУДНІК

Тыднёвік Магілёўскі

Аналітычна-інфармацыйная газэта, заснаваная Магілёўскай гарадзкой асацыяцыяй "КОЛА СЯБРОЎ".

Зарэгістраваная ў Дзяржкамітэце РБ па друку за № 831.

Газэта выходзіць шточацьвер.



АДРАС РЭДАКЦЫІ:

212030, г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.



Тэлефон: 31-04-15,
Тэл./факс: 22-97-82,
E-mail: krug@user.unibel.by

Газэта надрукаваная афсэтным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.Свярдлова. Замова 5. Наклад 500 асобнікаў.